Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 САКАВІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 48
(26406)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Прыняцце Асноўнага Закона стала важнай падзеяй у жыцці нашай краіны, значнай вяхой у станаўленні дзяржаўнасці Беларусі.

Канстытуцыя прадоўжыла дэмакратычныя традыцыі беларускага народа, адкрыла новыя магчымасці для адраджэння яго духоўных і культурных каштоўнасцяў. Яе асноўныя палажэнні накіраваны на захаванне сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве, абарону правоў і свабод грамадзян, забеспячэнне зладжанай і эфектыўнай работы ўсіх звёнаў улады.

Канстытуцыя з'яўляецца ядром прававой сістэмы дзяржавы, вызначае сэнс і змест іншых актаў заканадаўства. На аснове галоўнага Закона мы імкнёмся зрабіць жыццё людзей дастойным і шчаслівым. Рэспубліка Беларусь сёння — гэта краіна з эканомікай, якая дынамічна развіваецца. Беларусы маюць магчымасць стваральна працаваць, гадаваць дзяцей у спакойнай і добразычлівай абстаноўцы.

Мы ганарымся сваёй цудоўнай Радзімай — 65 гадоў таму наш народ гераічна адстаяў свабоду і ўнёс велізарны ўклад у Вялікую Перамогу над фашызмам. Перакананы, што дабрабыт краіны ў многім вызначаецца нашым уменнем працаваць, выконваць свае абавязкі ў адносінах да дзяржавы, знаходзіць новыя рашэнні штодзённых задач. Толькі разам мы можам пабудаваць моцную і квітнеючую Беларусь.

Жадаю вам новых здзяйсненняў, здароўя, шчасця, дастатку, поспехаў і аптымізму. Няхай гэта свята надасць сілаў і ўпэўненасці ў дасягненні пастаўленых мэтаў на карысць роднай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

15-ГОДДЗЕ 15 САКАВІКА

Роўна столькі спаўняецца заўтра Канстытуцыі незалежнай Беларусі

15 гадоў таму Парламент нашай краіны прыняў Канстытуцыю незалежнай Беларусі. Упершыню на ўзроўні найвышэйшага палітыка-прававога акта была замацавана воля беларускага народа да пабудовы дэмакратычнай прававой сацыяльнай дзяржавы. Грамадзяне Беларусі атрымалі дзейсныя канстытуцыйныя гарантыі непахіснасці сваіх палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных правоў. Іх пералік не толькі адпавядае сучасным міжнародна-прававым стандартам, але ў многім іх паглыбляе. У першую чаргу гэта датычыцца шырокага кола сацыяльных правоў асобы.

У сям'ю паўнапраўных членаў міжнароднай супольнасці Беларусь уступіла з пэўнымі здабыткамі ў галіне канстытуцыйнага развіцця. Яшчэ ў статутах Вялікага княства Літоўскага, якія безумоўна можна разглядаць у якасці юрыдычных дакументаў канстытуцыйнага характару, змяшчаліся нормы, што замацоўвалі неад'емныя правы чалавека і найважнейшыя прававыя прынцыпы: вяршэнства пісанага права, роўнасць усіх перад законам, законнасць дзейнасці дзяржаўных органаў і службовых асобаў, правы кожнага чалавека на ахову жыцця і гонару, недатыкальнасць асобы, свабоднае валоданне маёмасцю, судовую абарону.

Варта нагадаць яшчэ адзін сёлетні юбілей — 90-годдзе Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя 1919 года не толькі абвясціла беларускую нацыянальную дзяржаўнасць, скасавала сацыяльныя прывілеі, але і ўсталявала дзейсную сістэму органаў кіравання, замацавала асобныя палітычныя і сацыяльныя правы — такія, як свабода саюзаў, сходаў, мітынгаў, свабоднае распаўсюджванне друкаванай прадукцыі, права на бясплатную адукацыю. Гэта быў першы Асноўны Закон, які юрыдычна замацаваў сучасную назву нашай краіны — Беларусь — і стаў актам палітычнага самавызначэння беларускага народа.

Канстытуцыйнае будаўніцтва — дынамічная з'ява. Яно павінна не толькі адпавядаць узроўню развіцця сацыяльных адносінаў, але і ў чымсьці іх апярэджваць, быць накіраваным на перспектыву. Таму сучасны Асноўны Закон, працягваючы дэмакратычныя традыцыі беларускага канстытуцыяналізму, замацоўвае пэўнае кола канстытуцыйных гарантый правоў асобы і праз свае праграмныя палажэнні вызначае вектар развіцця грамадства на пабудову дэмакратычнай прававой сацыяльнай дзяржавы.

Няўхільнае выкананне ўсімі грамадзянамі, дзяржаўнымі органамі і службовымі асобамі нормаў Канстытуцыі стварае неабходныя перадумовы існавання ў краіне належнай канстытуцыйнай законнасці. Забеспячэнне канстытуцыйнай законнасці ў нашай дзяржаве з'яўляецца галоўнай задачай дзейнасці Канстытуцыйнага Суда — спецыялізаванага органа канстытуцыйнага кантролю. Канстытуцыйны Суд Беларусі з'яўляецца равеснікам нашай Канстытуцыі, ён таксама створаны ў 1994 годзе на падставе яе нормаў. З моманту свайго заснавання Канстытуцыйны Суд прыняў больш за 500 рашэнняў, якія датычацца розных аспектаў функцыянавання прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Кошт кошыка валют — 960,74 рубля

Па выніках учарашніх таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы кошт кошыка валют склаў 960,74 рубля, што практычна адпавядае яго ўзроўню на момант увядзення 2 студзеня, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Нагадаем, што на канец студзеня кошт валютнага кошыка складаў каля 912 рублёў. Гэта значыць, што з моманту яго ўвядзення 2 студзеня, калі пачатковы кошт складаў 960 рублёў, беларускі рубель на той час умацаваўся да кошыка на 5 %. Тады ж старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч заявіў журналістам аб тым, што курс рубля па выніках першага квартала вернецца ў нулявы калідор хістання. Што насамрэч і адбылося. З моманту ўвядзення прывязкі курса нацыянальнай валюты да кошыка зніжэнне беларускага рубля да долара склала 8,7 %, да еўра — 0,6, да расійскага рубля наш умацаваўся на 8,3 %. У далейшым, падкрэсліваюць у Нацбанку, кошт кошыка валют будзе падтрымлівацца галоўным банкам у межах 5-працэнтнага калідора дапушчальных адхіленняў. Пры гэтым змяненні двухбаковых курсаў беларускага рубля ў адносінах да валют, што ўваходзяць у склад кошыка, будуць вызначацца ў асноўным узаемнымі хісткамі гэтых валют на сусветных рынках.

Ігар ГРЫШЫН.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства двухэтажного кирпичного здания с инвентарным номером 500/С-17147 общей площадью 374,2 кв. м, (балансодержатель – ЗАО «Инвесткапстрой»), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, 5, корп. 6.

Начальная цена – 1 128 910 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка 0,0739 га.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 100 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **21 апреля 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **20 апреля 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22.

УНП 190398583

З вёсламі і «кашалыкамі» пазіруе чалавек з залатымі рукамі, жыхар вёскі Ладараж Пінскага раёна Іван НОСКА. Вёслы ён робіць па ўсіх правілах — толькі з ясеня.

ЛАДАРАЖ

Не назва, а сапраўдны эксклюзіў. На цэлую краіну адна такая са шматзначным імем вёска. Хто толькі не ламае галаву, каб спасцігнуць сутнасць слова Ладараж. Нават вясковы ляснік Уладзімір Паляйчук мае на гэты конт асабістую версію: калісьці тут добра, ці ладна, як ён кажа, радзіла рож (жыта). З лесніком цяжка не пагадзіцца: ён ведае каштоўнасць зямлі дзякуючы мазалям на ўласных далонях. Глеба тут хлебадайная, і недарэмна яго продкі аблюбавалі сярод пінскіх балотаў менавіта гэты кавалак зямлі, моцна трымаліся свайго поля і ў выніку сталі Палейчукамі. Пакуль мы мінаем вясковыя хаты, перасякаем раку Стыр і закутае льдом балота, Уладзімір распавядае пра свой радавод, пра дзеда Пятра, які пры Польшчы таксама служыў лесніком. Як сапраўдны экскурсавод, ён стварае ў маім уяўленні маляўнічы партрэт палескай вёскі, схаванай ля самай мяжы з Украінай. Мне ж застаецца ўтульна ўладкавацца ў санках на духмяным сене і, наставіўшы ад марозу і ветру каўнер, услухоўвацца ў загадкавую паляшуцкую мову, поўную дыялектаў і вобразаў. «Дажэ кінь нэ ідэ, бо дань холодны і віцюр дма», — кажа ляснік, тузаючы лейцамі каня.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Працоўны дзень пераносіцца з 27 красавіка на 25 красавіка

У Беларусі пераносіцца працоўны дзень з панядзелка 27 красавіка на суботу 25 красавіка гэтага года. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове ўрада № 306 ад 12 сакавіка 2009 года, паведамілі ў Апараце Савета Міністраў. Арганізацыям даецца права з улікам спецыфікі вытворчасці (працы) ажыццяўляць перанос працоўнага дня ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

БЕЛТА.

На Камароўцы падаражэлі кураняты, яйкі і цытрусавыя. Патаннелі свініна, свежыя гуркі і крупы

Па традыцыі пачнём наш агляд з мяса. Калі браць пад увагу мінімальны кошт на гэтую прадукцыю, дык у параўнанні з трохтыднёвай сітуацыяй ён знізіўся на тысячу рублёў з кілаграма на філе свініны (да 17 тысяч рублёў), на грудзінку для смажання (да 11 тысяч), на тры тысячы на шыю (да 15 тысяч), на 500 рублёў на салёнае сала-грудзінку (да 13 тысяч). А вось максімальная цана на гэтыя прадукты, за выключэннем шыі, дзе верхняя планка таксама знізілася на тысячу — да 21 тысячы, засталася ранейшай: адпаведна 22, 15 і 19,5 тысячы за кілаграм. Кумпяк і лапатка не змянілі за гэты час ні мінімальнага, ні максімальнага кошту. Яна апошнімі днямі прадаваліся па 14-19 і 13-17 тысяч рублёў за кілаграм адпаведна. На свежае сала мінімальная цана таксама захавалася на ўзроўні 6 тысяч, максімальная — знізілася на адну тысячу (да 12 тысяч). Па-ранейшаму каштуе і цяляціна — ад 18 да 28 тысяч за кілаграм. Найбольшыя зрухі закранулі абедзве «планкі» на ялавічыну. Цяпер яна каштуе 12-26 тысяч супраць 13-28 тысяч рублёў за кілаграм тры тыдні таму.

Па ўсіх «франтах», наадварот, падаражэлі кураняты — да 7190-7870 рублёў за кілаграм супраць колішніх 7030-7800 рублёў. Калі гаварыць пра каўбасныя вырабы, дык кошт на вараную каўбасу вышэйшага гатунку практычна ніяк не змяніўся (9,9-15,9 тысячы), на паўвэнджаную і сыравэнджаную крыху зменшылася мінімальная цана (адпаведна да 8990 і 19900 рублёў), у той час як максімальная засталася ранейшай (24,9 і 38,9 тысячы за кілаграм).

Калі закрануць малочную групу тавараў, можна заўважыць, што крыху павялічылася максімальная цана на тварог — з 6580 да 7450 рублёў, а ў прыватнікаў на гэты ж прадукт на тысячу рублёў (да 10 тысяч) «стартанула» ніжняя планка кошту. Смятана днямі каштавала на рынку 3080-6260 супраць 3080-7320 рублёў тры тыдні таму. Аналагічны прадукт з асабістых падворкаў ішоў па 10-12 тысяч супраць ранейшых 9-12 тысяч за кілаграм. Сметанковае масла захавала «пазіцыі»— 8110-15500 рублёў, хіба толькі верхняя планка кошту ў прыватнікаў знізілася на 500 рублёў — да 15-18 тысяч. На 70 рублёў па максімальным кошце патаннела малако, зараз яго можна набыць тут па 940-1700 рублёў.

Падаражэлі адразу па абедзвюх пазіцыях, як і кураняты, яйкі ад птушкафабрык. Цяпер дзясятак каштуе 2580-4100 супраць ранейшых 2,4-3,9 тысячы. На пяць тысяч адразу патаннеў мёд, праўда, толькі па верхняй планцы, зараз яго прапануюць па 25-30 тысяч за кілаграм. Тры тыдні таму бутэлька алею каштавала на Камароўцы 3020-6200 рублёў, апошнімі днямі — 3100-5620.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва за студзень знізіліся на 15 працэнтаў

у параўнанні са снежнем 2008 года. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце рэспублікі.

Паводле інфармацыі Белстата, у студзені 2009 года рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ўзраслі на 7,7 працэнта ў параўнанні са студзенем 2008 года. Як паведамлялася БЕЛТА раней, паводле папярэдніх даных, у Беларусі ў 2008 годзе рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ўзраслі на 12,7 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам (прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2008 год быў прадугледжаны рост грашовых даходаў насельніцтва ў рэальным выражэнні на 9-10 працэнтаў). Прычым дынаміка павелічэння гэтага паказчыка захоўвалася на працягу некалькіх месяцаў. Так, за 11 месяцаў мінулага года рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ўзраслі на 12,3 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года, за 10 месяцаў — на 12,1 працэнта...

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДАКУМЕНТЫ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ВАЙНЫ Ў ІРАКУ ВЫКЛІКАЛІ СКАНДАЛ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Даныя рассакрэчанай у Вялікабрытаніі перапіскі супрацоўнікаў спецслужбаў паказалі, што ўрад краіны наўмысна перабольшыў пагрозу, якая быццам бы ішла ад рэжыму Садама Хусейна, пры падрыхтоўцы дакументаў, што абгрунтоўвалі неабходнасць ваеннага ўварвання ў Ірак, паведамляе The Independent.

Пасля апублікавання сакрэтнай перапіскі ценявы міністр замежных спраў Уільям Хейг заявіў, што поўнамаштабнае расследаванне ўсіх акалічнасцяў пачатку вайны ў Іраку павінна пачацца неадкладна. Раней міністр юстыцыі Вялікабрытаніі Джэк Стро не дазволіў апублікаваць пратакол пасяджэння ўрада, на якім было прынята рашэнне аб удзеле брытанскіх войскаў ва ўварванні ў Ірак. Паводле яго словаў, публікацыя гэтай інфармацыі нанесла б «сур'ёзную шкоду» кабінету міністраў.

Нагадаем, што брытанскія войскі ў Іраку завершаць сваю місію і будуць выведзеныя з краіны ў першай палове 2009 года.

ПАЛОВА ПРАВЕРАНЫХ РАСІЙСКІХ МІГАЎ НЕ ДАПУШЧАНА ДА ПАЛЁТАЎ

Каля 90 знішчальнікаў МіГ-29 забракаваныя ў ходзе аглядаў парка авіяцыйнай тэхнікі пры расследаванні катастрофы, што адбылася ў Забайкаллі.

У цяперашні час з агульнай колькасці гэтых самалётаў агледжана каля 200. З іх дапушчаны да палётаў крыху больш за 100, а прыкладна 90 МіГ-29 адхілены ад палётаў. Праверкі працягнуцца.

МЭРУ КІЕВА ПРЫЗНАЧЫЛІ ПСІХІЯТРЫЧНУЮ ЭКСПЕРТЫЗУ



Часовая камісія Вярхоўнай Рады па пытаннях расследавання дзейнасці кіеўскай улады 13 сакавіка аднагалосна прагаласавала за тое, каб правесці псіхіятрычную экспертызу сталічнага кіраўніка горада Леаніда Чарнавецкага, паведамляе «Украінская праўда».

Камісія была створаная для расследавання акалічнасцяў парушэння канстытуцыі і законаў, прыняцця супрацьпраўных рашэнняў службовымі асобамі Кіеўскай гарадской рады і мэрыі. Леанід Чарнавецкі вядомы сваімі эксцэнтрычнымі паводзінамі, якія неаднаразова давалі падставу яго апанентам усумніцца ў адэкватнасці кіраўніка сталічнай адміністрацыі.

АМЕРЫКАНЦЫ ПАБЯДНЕЛІ НА 18 %

Дабрабыт амерыканскіх сем'яў упаў на 18 % у 2008 годзе, паведамляе The Wall Street Journal. Гэтае найзначнейшае падзенне ўзроўню жыцця з часу заканчэння Другой сусветнай вайны.

Згодна са статыстыкай, летась амерыканцы сталі бяднейшымі на 11 млрд долараў, што адпавядае штогадоваму прыбытку немцаў, японцаў і брытанцаў разам узятых. Паводле меркавання выдання, статыстыка сігналізуе аб тым, што эра таннага жылля, росту пенсій і масавых інвестыцый скончылася.

Агульны доўг амерыканцаў па крэдытах, у тым ліку па іпатэцы, на канец мінулага года склаў 13 трлн долараў, што складае 123 % гадавога прыбытку жыхароў ЗША. У 1995 годзе, для параўнання, гэтая лічба складала 83 %.

Як нас дураць

Махляры «палявалі» за дарагімі аўто

На працягу двух гадоў у Мінску невядомым прайдзісветам удалося ўчыніць серыю махлярстваў, у выніку якіх сталічныя салоны па пракаце аўтамабіляў не далічыліся больш за дзясятак дарагіх «жалезных коней».

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, рэгістраваліся падобныя факты ў Мінску пазалетась і летась. Пасля праведзенага аналізу інфармацыі, схем і абставінаў гэтых злачынстваў праваахоўнікі прыйшлі да высновы, што размах, з якім дзейнічалі зламыснікі, сведчыць: крымінальным «бізнэсам» займаецца арганізаваная злачынная група. Каб яе выкрыць, з найбольш вопытных супрацоўнікаў міліцыі была створана спецыяльная група, каардынацыя якой ажыццяўлялася крымінальным вышукам ГУУС.

Дарагія машыны ў пракатных фірмах зламыснікі атрымлівалі па падробных дакументах, і пасля дакументальнага афармлення і шчодрай перадаплаты пакідалі тэрыторыю Беларусі на аўтамабілях.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

У НЕВЯЛІКІХ ГАРАДКАХ ЖЫЛЛЁ ПАКУЛЬ ІСТОТНА НЕ ПАТАННЕЛА

Мой даўні сябар Сяргей Сайкавіч цяпер жыве ў невялікім гарадку Брэсцкай вобласці. Пэўны час ён займаўся гандлем жылля, таму ўпэўнены, што сённяшняе патанненне кватэр на другасным рынку сталіцы і абласных цэнтраў «дакоціцца» да раённых цэнтраў не раней чым праз 5—7 месяцаў. «З другога боку, — адзначыў былы аднакласнік, — у сталіцы, мне здаецца, «чаргавікі» маюць магчымасць будаваць сабе жыллё таннейшае, чым на раёне». Мы вырашылі прааналізаваць становішча і «паводзіны» рынкаў жылля на прыкладзе двух раённых цэнтраў у заходнім і ўсходнім рэгіёнах нашай краіны.

НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ ЖЫЛЛЯ ЛЯХАВІЧАЎ ПОПЫТ МІНІМАЛЬНЫ

Колькасць насельніцтва раённага цэнтра Брэсцкай вобласці горада Ляхавічы складае менш за 12 тысяч чалавек, таму агенцтваў нерухомасці тут няма. Людзі самастойна шукаюць ці прадаюць кватэры на другасным рынку з дапамогай мясцовай газеты і «сарафаннага радыё», якое ў невялікім гарадку дзейнічае нават лепш.

Пасля таго, як у пачатку года істотна пацяжэў долар і валютныя крэдыты пад набыццё жылля ўзяць стала даволі цяжка і дорага, другасны рынак кватэр гэтага райцэнтра амаль зусім «замарозіўся». Нягледзячы на мінімальны попыт, цэннікі на кватэры засталіся на мінулагоднім узроўні. Абазначыць сярэдні кошт такога жылля даволі складана, бо ён часам моцна вагаецца нават па аднатыпным жыллі — у залежнасці ад паверхаў, якасці рамонта і перапланіроўкі, а галоўнае — ад апетытаў гаспадароў. Цяпер аднапакаёвую кватэру тут можна набыць прыкладна за 21—22 тысячы долараў, двухпакаёвую за 26—27, а трохпакаёвую за 30—31 тысячу долараў. Прыватныя дамы з пячным ацяпленнем, з прыродным газам, але з выгодамі ў дварыі, каштуюць не менш за 15—17 тысяч долараў. Попытам такое жыллё ў маладога насельніцтва райцэнтра амаль не карыстаецца, бо адразу за горадам існуе цэлы дачны пасёлак, дзе магчыма вырошчваць агародніну і адпачываць.

У Ляхавічах у апошнія гады актыўна развіваецца прыватны бізнэс па рамонце патрыманых замежных аўтамашын. У сувязі з гэтым стандартныя прасторныя гаражы ў гаражных кааператывах каштуюць прыкладна 6—7 мільёнаў рублёў. У мясцовым гарвыканкаме рэдакцыі паведамілі, што насельніцтва горада з кожным годам павялічваецца за кошт міграцыі моладзі з суседніх вёсак. Невялікія кампактныя Ляхавічы пастаянна будуюцца.

Паводле слоў кіраўніка мясцовага УКБ Мікалая Асецкага, у горадзе будуюцца толькі пяціпавярховыя цагляныя дамы. У такіх дамах кватэры маюць сучасную планіроўку, дзе прасторная кухня, а агульная плошча аднапакаёвак складае каля 40—41 кв. м., двухпакаёвак — 60, а трохпакаёвак — да 80 квадратных метраў.

Мікалай Іванавіч адзначыў, што сёлета будаўніцтва жылля, у параўнанні з мінулым годам, падаражэла прыкладна больш чым на 35 %. Летась для чаргавікоў квадратны метр жылля каштаваў 1 млн 494 тысячы рублёў, калі за аднапакаёвую кватэру трэба было заплаціць каля 62 мільёнаў, за двухпакаёвую — 89, а за трохпакаёвую — ажно 118 мільёнаў рублёў. Сёлета ў горадзе будзе будавацца 69-кватэрны цагляны дом, у якім, паводле папярэдніх падлікаў, квадратны метр можа каштаваць ужо 2 млн 195 тысяч рублёў. Спецыялісты УКБ удакладняюць, што канчатковы кошт жыллёвага «квадрата» можа быць і меншым, але ў гэта неяк не верыцца. Атрымліваецца, што аднапакаёвая кватэра ў новым доме будзе каштаваць для навасельцаў каля 30 тысяч долараў, а трохпакаёвая — больш за 55 тысяч долараў. Вядома, што новае больш камфортнае жыллё лепшае за старое, але на другасным рынку кватэры ў Ляхавічах значна таннейшыя. Тады чаму людзі амаль не звяртаюць увагі на другасны рынак мясцовага жылля? Прычына ў тым, што бадай усе чаргавікі будуюць кватэры з выкарыстаннем льготных крэдытаў. Паводле інфармацыі спецыяліста жыллёвага аддзела выканкама Людмілы Віктараўны, сёння ў агульнай жыллёвай чарзе знаходзяцца 683 чалавекі. Зараз крэдытуюцца пад будаўніцтва жылля тыя чаргавікі, хто стаў на ўлік у 2006 годзе. На ўліку ў выканкаме знаходзіцца 71 шматдзетная сям'я. Тут трэба дадаць, што ў гэты спіс уваходзяць і тыя сем'і, хто ўжо будуецца, але ключы ад кватэры яшчэ не атрымаў. У жыллёвым аддзеле запэўнілі, што тыя, хто гэтымі днямі стаў на жыллёвы ўлік па асобным спісе шматдзетных сем'яў, будуць абавязкова ўключаны ў наступны каператыў, па якім будаўніцтва павінна пачацца ўжо ў 2010 годзе.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне будзе.)

БПС-БАНК

С 16 марта 2009 г.
ОАО «БПС-Банк» предлагает срочный банковский депозит для физических лиц в белорусских рублях

«ПЕРСПЕКТИВНЫЙ»

на следующих условиях:

Размер процентов	**22 % годовых**	
Срок хранения	**18 месяцев**	
Досрочное расторжение	**до 3-х месяцев**	**ставка текущих счетов;**
	от 3 до 12 месяцев	**установленная ставка минус 2 процентных пункта;**
	свыше 12-ти месяцев	**установленная ставка**
Условия частичного востребования средств	**до остатка 2 000 000 руб.:**	
	до 12 месяцев	**установленная ставка минус 2 процентных пункта;**
	свыше 12 месяцев	**установленная ставка**
Сумма первоначального взноса	**1 000 000 рублей**	
Порядок начисления и выплаты процентов	**ежемесячная капитализация, выплата по желанию вкладчика, выплата за любое количество периодов начисления**	
Дополнительные взносы	**без ограничения суммы и периодичности внесения**	
Пластиковая карточка	**возможно перечисление на карт-счет ежемесячно начисляемых процентов и суммы депозита по окончании его срока**	
Иные условия	**возможность заключения договора на имя другого лица**	

Одновременно прекращен прием денежных средств на условиях срочного банковского депозита «Успешный-Плюс».

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте (www.bpsb.by) или по телефону – 148 (бесплатно в стационарной сети).

Сохранность и возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 880,00
1 еўра	3 724,13
1 латвійскі лат	5 270,86
1 літоўскі літ	1 078,73
1 чэшская крона	141,07
1 польскі злоты	835,15
1 расійскі рубель	82,68
1 украінская грыўня	366,88

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	34,8316
10 UAH	44,3715
1000 BYR	12,0901
EUR	44,9258

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

На Камароўцы падаражэлі кураняты...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Патаннелі многія крупы. Скажам, рыс зараз прадаюць па 3390-5640 рублёў (тры тыдні таму было 3440-6750), грэцкія крупы — па 2060-3300 (было 2140-4610), гарох — па 1640-2710 рублёў за кілаграм (ранейшы кошт складаў 1680-3190). Проса стала менш каштаваць — 1470-2940 рублёў (каліс было 1910); манка — больш: 1950-2555 рублёў (была 1730). Макарону прапануюць па 2330-6650 рублёў за кілаграм, а раней — па 3210-7380.

Што ў рыбных радах? Хек каштаваў 14-14,5 тысячы рублёў за кілаграм, цяпер — 12,9-15,9 тысячы, скумбрыя тры тыдні таму была па 9,9-13,7 тысячы, зараз — па 7-15,9 тысячы. Мінтай — падаражэў ўсяго на 200 рублёў (да 8,8 тысячы за кілаграм). Карпа можна купіць па 4500-6650 рублёў, у той час як тры тыдні таму — па 3820-6650.

Патаннелі свежыя шампіньёны. Цяпер іх можна набыць па 7,5-9 тысяч за кілаграм, а раней кошт гэтых грыбоў складаў 8,8-11,2 тысячы рублёў. Пачак маянэзу (200-250 грамаў) каштуе зараз на рынку 1050-1780 супраць колішніх 960-1780 рублёў.

Калі гаварыць пра айчынную гародніну — бульбу, капусту, моркву, цыбулю, дык асаблівых цэнавых зрухаў на яе не назіраецца, прычым, датычыцца гэта як прыватнікаў, так і індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асобаў (ваганні коштаў складаюць 50-100 рублёў). Чамусьці толькі на буракі яны больш істотныя. Так, прыватнікі днямі гандлявалі гэтымі караняплодамі па 1000-1950 рублёў, астатнія прадаўцы — па 840-1200 (было адпаведна 500-1950 і 770-800 рублёў за кілаграм). Часнок зараз на Камароўцы прадаюць па 5270-7000 рублёў, а тры тыдні таму цана складала 3910-8000. Найбольш заўважна з моманту нашага апошняга маніторынгу падаражэў салодкі перац. Зараз ён ляжыць на прылаўках па 11,5-13 тысячы супраць колішніх 9,5—11,5 тысячы рублёў. Падаражэлі і памідоры — да 5500-9280 (а было 5000-8270). Свежыя агуркі, наадварот, сталі каштаваць менш: цяпер яны абыдуцца пакупніку ў 6-9 тысяч за кілаграм, а адносна нядаўна на іх набыццё патрабавалася 9620-9800.

Закрануўшы садавіну, варта адразу заўважыць, што найбольш заўважна падаражэлі цытрусавыя. Так, кілаграм мандарынаў ужо каштуе 5,5-7,5 тысячы (было 4,3-5,5 тысячы), апельсінаў — 4,2-6,5 (супраць колішніх 3-4,5 тысячы). На 500-1000 рублёў павялічыліся цана на грушы — да 5,5-10 тысяч за кілаграм. На 100-1000 рублёў падаражэлі і бананы — да 3,5-5 тысяч. Лімоны на рынку зараз каштуюць 4-6 тысячы (было 4,5-5,5 тысячы). Затое на тысячу стаў менш па ніжняй планцы імпартны вінаград: ён зараз прапануецца па 4-15 тысяч за кілаграм. На 300 рублёў знізіўся мінімальны кошт на яблыкі — да 1,5-4,5 тысячы рублёў. Грэйпфруты, наадварот, падаражэлі па верхняй планцы да 4,5-7 тысяч (ранейшы кошт складаў 5-5,8 тысячы).

Гваздзікі зараз каштуюць на Камароўскім рынку 2,5-3,5 тысячы за кветку (былі па 2-3 тысячы), ружы — 4-14 тысяч (былі па 3,5-15 тысяч рублёў).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Банкіры разлічваюць на рост...

Стаўкі па валютных дэпазітах будуць зніжацца і надалей, выказаў сваё меркаванне падчас сустрэчы з журналістамі, прымеркаванай да падпісання ўстаноўчых дакументаў некамерцыйнай Еўразійскай Асацыяцыі сельскагаспадарчага крэдыту, старшыня праўлення Белаграпрамбанка Сяргей Румас.

Прынамсі, у планах Белаграпрамбанка, які прымае адпаведныя рашэнні, зыходзячы з сітуацыі на рынку, праз квартал вызначыць стаўкі па валютных дэпазітах на ўзроўні 10-11%. Што датычыцца непасрэдна стварэння Еўразійскай Асацыяцыі сельскагаспадарчага крэдытавання, ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі якой былі Белаграпрамбанк і Рассельгасбанк (РФ), то яна аб'яднае аграбанкі і крэдытныя арганізацыі, паводле слоў Сяргея Румаса, краін былога СССР. Дарэчы, штаб-кватэра асацыяцыі будзе знаходзіцца ў Мінску. Асноўнымі ж мэтамі яе стануць, у прыватнасці, вырашэнне практычных задач у сферы развіцця сельскай гаспадаркі, садзейнічанне стварэнню ўмоў для эфектыўнага функцыянавання банкаўскай сістэмы ў аграпрамысловым комплексе краін — удзельніц асацыяцыі і забеспячэнне яе стабільнасці.

Першы намеснік старшыні праўлення ААТ «Рассельгасбанк» Станіслаў Баранаў заявіў аб гатоўнасці нарошчваць фінансаванне расійскім банкам закупак беларускай сельгастэхнікі, якая «карыстаецца заслужаным попытам і аўтарытэтам у Расіі». На закупку сельгастэхнікі беларускай вытворчасці не будзе распаўсюджвацца загад Рассельгасбанка, што забараняе крэдытаванне закупак імпартнай сельгастэхнікі. «Я мяркую, — заявіў Станіслаў Баранаў, — што на гэты від тэхнікі братняга нам народа і сяброўскай дзяржавы гэты загад распаўсюджвацца не будзе». Каментуючы інфармацыю наконт набыцця долі ў Белаграпрамбанку, расійскі банкір заўважыў, што пакуль гэтае пытанне з'яўляецца заўчасным. «Ніякіх анонсаў на гэты конт мы пакуль рабіць не будзем», — дадаў ён. Станіслаў Баранаў таксама паведаміў, што ўчора Рассельгасбанк адкрыў сваё прадстаўніцтва ў Беларусі. «Для нас гэта вельмі сімвалічна, — падкрэсліў ён, — паколькі наша кааперацыя і аб'ёмы знешняга гандлю дазваляюць разлічваць на далейшы рост бізнэсу, узаемнага гандлю і фінансавання».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Махляры «палявалі» за дарагімі аўто

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ужо ў Расіі гэтыя аўто нелегальным чынам прадаваліся, і большасць з іх да гэтага часу так і не знойдзеныя.

Затое сталічным правахоўнікам удалося ўстанавіць асобы махляроў і затрымаць іх: як высветлілася, да крадзяжу аўтамабіляў з пракатных салонаў мелі дачыненне трое расійскіх грамадзян. На рахунку членаў гэтай групы як мінімум 15 фактаў падобных махлярстваў. Прычым, не выключана, не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах краіны. Што датычыцца пацярпелых аўтаўладальнікаў, то пакуль пашанцавала толькі двум, машыны якім у тэхнічна спраўным стане ўжо вернутыя. У прыватнасці, у Смаленску ў леташнім лістападзе быў знойдзены зніклы «Сітраен С-5» 2007 года выпуску, а ў Мажайску крыху раней — аўтамабіль «Фольксваген-Каравэла» 2006 года выпуску. Пошук астатніх аўтамабіляў працягваецца.

Як адзначыў Аляксандр Ластоўскі, падчас расследавання гэтай справы сталічныя следчыя выйшлі на яшчэ адну злачынную групу, у склад якой уваходзяць таксама расіяне, якія падазраюцца ў некалькіх аналагічных злачынствах. Ужо выяўленыя асобы двух фігурантаў апошняй групы, інфармацыя пра якіх перададзеная расійскім праваахоўнікам для арганізацыі пошукавых мерапрыемстваў.

Ігар ГРЫШЫН.

15-ГОДДЗЕ 15 САКАВІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда, якія фармулююцца ў яго рашэннях, з'яўляюцца асновай для ўдасканалення заканадаўства і практыкі яго прымянення. У выніку дзейнасці Канстытуцыйнага Суда сфера канстытуцыйных правоў і свабод атрымала дадатковы імпульс для далейшага развіцця.

Значным крокам у пошуку дадатковых мераў забеспячэння канстытуцыйнай законнасці ў Беларусі з'явілася прыняцце Дэкрэта Прэзідэнта «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь». Паводле яго Канстытуцыйны Суд атрымаў паўнамоцтвы на ажыццяўленне абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і ўхваленых Саветам Рэспублікі, да іх падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

З увядзеннем абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў у нашай дзяржаве ўсталёўваюцца дадатковыя юрыдычныя механізмы, якія папярэджваюць прыняцце заканадаўчых нормаў, што пярэчаць Канстытуцыі. Гэта садзейнічае павышэнню эфектыўнасці нарматворчасці, удасканаленню якасці законаў, аптымізацыі прававога рэгулявання ў цэлым. З прыняццем Дэкрэта ў краіне ствараюцца ўмовы для больш поўнай рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Сёння, у складаны час сусветнага эканамічнага крызісу, дзяржаўныя органы прыкладаюць усе намаганні для таго, каб канстытуцыйныя правы былі надзейна абаронены. І толькі сумесная працаздольнасць, у якой можна адшукаць любую задуманую паслядоўнасць лічбаў! У Кнігу рэкордаў Гінеса занесена дасягненне вучоных з Такійскага ўніверсітэта, якія затрацілі 400 гадзін машыннага часу на суперкамп'ютары, але вызначылі «пі» да 12411-трыльённага знака і паставілі сусветны рэкорд. Між іншым, спецыялісты лічаць, што лічба гэта выкарыстоўвалася яшчэ пры будаўніцтве Вавілонскай вежы, і менавіта недастатковае вылічэнне прывяло да краху ўсяго праекта... Так што на ўсялякі выпадак запішвайце, мо спатрэбіцца: 3,141592653589 (далей — на фота).

Абзац

■ **Сёння спаўняецца 510 гадоў, як Мінск стаў карыстацца магдэбургскім правам. Жыхары гарадоў, якія яго атрымлівалі, вызваляліся ад феадальных павіннасцяў, ад суда і ўлады ваяводаў.**

■ Кожны трэці ўрач хуткай дапамогі ў Беларусі — пенсіянер. Аб гэтым учора на рэспубліканскай нарадзе па выніках працы службы хуткай дапамогі паведаміў галоўны пазаштатны спецыяліст па хуткай меддапамозе Міністэрства аховы здароўя, галоўурач Мінскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Віктар Сірэнка

■ **Бурыя мядзведзі ў Бярэзінскім біясферным запаведніку пачалі выходзіць з зімовай спячкі, паведаміў БелТА нам. дырэктара гэтай прыродаахоўнай установы Валерый Іўковіч. Падчас апошніх абходаў вучоныя заўважылі першыя сляды мядзведзяў. Масавае прабуджэнне мядзведзяў чакаецца ў пачатку красавіка. Сёння ў Беларусі налічваецца больш за сто асобін бурага мядзведзя.**

Поўны абзац

■ Неверагодная гісторыя здарылася з адной жыхаркай украінскага горада Марыупаля. Яна зняла ў банкамаце 1,5 тыс. грыўняў трыма купюрамі па 500 грыўняў, і адна з іх была мечаная. Гэта высветлілася, калі жанчына расплачвалася за пакупкі ў гіпермаркеце. Касірка праверыла купюру, як звычайна, на дэтэктары, і ў гэты час на банкноце высвеціласа слова «хабар». Уладальніца купюры была ў стане шоку, бо выходзіла, што хабар ёй выдаў банкамат. Касірка параіла звярнуцца да адміністратаркі, тая ў сваю чаргу званіла «вышэй». Урэшце касірцы паступіла каманда: калі купюра сапраўдная, бяры. У банку патлумачылі, што купюра, памечаная фарбай, з'яўляецца плацежаздольнай. Бо фарба праз два дні знікае. Як такая банкнота магла трапіць у банкамат, высветліць не ўдалося.

■ **76-гадовы жыхар сяла Калодзенка Ровенскага раёна 9 сакавіка не зусім звычайным чынам дамагаўся вяртання часткі свайго ўкладу на дэпазіце ў аддзяленні «Укрпрамбанка». Ён прыйшоў у банк і запатрабаваў грошы з дэпазіту, таму што тэрмін апошняга закончыўся. Супрацоўнікі банка адмовіліся выдаць грошы і прапанавалі падоўжыць тэрмін дэпазіту. Мужчына паабяцаў аб'явіць галадоўку, але гэта не напалохала клеркаў. Тады ён распрануўся дагала і стаў пагражаць, што падпаліць сябе. Да ўкладчыка выйшаў загадчык аддзялення і пасля перамоваў паабяцаў выдаць грошы. Назаўтра настойлівы кліент атрымаў трэць сумы, астатнія грошы павінен атрымаць часткамі.**

■ Дырэктар пахавальнай кампаніі з Нью-Ёрка прапанаваў незвычайную здзелку: ён шукае надзейнага падрадчыка, які змог бы якасна адрамантаваць яго кватэру ў абмен на такую ж якасную арганізацыю пахавання. Пітэр Доханіч, які вядзе свой бізнэс у трох амерыканскіх штатах, хоча кардынальна змяніць сваю гасцёўню. У абмен на гэта ён абавязуецца арганізаваць пахаванне, у тым ліку крэмацыю, бальзамаванне, труну, адпяванне ў царкве, а таксама катафалк і лімузін для родных і блізкіх. 51-гадовы Доханіч прызнаецца, што хто-ніхто лічыць яго аб'яву як мінімум дзіўнаватай, але запэўнівае, што яго прапанова зусім разумная — проста прафесіяналы абмяняюцца паслугамі.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Ёсць нагода

Бясконцасць пасля коскі

Са школьных часоў мы памятаем: даўжыня любога круга вылічваецца па формуле $2\pi r$, плошча таго ж круга — πr у квадраце, а сама лічба π роўная 3,14. Сёння (14 сакавіка ў амерыканскім напісанні абазначаецца як 3.14) ёсць асаблівая нагода ўшанаваць гэту лічбу — у свеце адзначаецца Міжнародны дзень лічбы Пі.

Наўрад ці хто, акрамя матэматыкаў, назаве значэнне «пі» з дакладнасцю больш чым дзве лічбы пасля коскі. Ды і матэматыкі абсалютна дакладнага адказу не дадуць — як высветлілі навукоўцы, гэта бясконцая матэматычная працягласць, у якой можна адшукаць любую задуманую паслядоўнасць лічбаў! У Кнігу рэкордаў Гінеса занесена дасягненне вучоных з Такійскага ўніверсітэта, якія затрацілі 400 гадзін машыннага часу на суперкамп'ютары, але вызначылі «пі» да 12411-трыльённага знака і паставілі сусветны рэкорд. Між іншым, спецыялісты лічаць, што лічба гэта выкарыстоўвалася яшчэ пры будаўніцтве Вавілонскай вежы, і менавіта недастатковае вылічэнне прывяло да краху ўсяго праекта... Так што на ўсялякі выпадак запішвайце, мо спатрэбіцца: 3,141592653589 (далей — на фота).

Разбурыць разбуральнае

14 сакавіка — міжнародны дзень барацьбы супраць плацін, «за рэкі, ваду і жыццё»

Ідэю адзначэння гэтага дня падалі ў 1998 годзе на першай міжнароднай сустрэчы людзей, якія пацярпелі ад будаўніцтва плацін. У 20 краінах свету, у тым ліку Бразіліі, Індыі, ЗША, Японіі, Расіі, Тайландзе, Аўстраліі, прайшлі дэманстрацыі, збор подпісаў пад лістамі пратэсту, ачыстка рэк і г.д.

Як сведчыць статыстыка, за апошнія паўстагоддзя ва ўсім свеце ў выніку будаўніцтва буйных плацін было перасялена не менш за 30 мільёнаў чалавек, затоплена прыкладна 400 тысяч квадратных метраў каштоўных лясоў і ўраджайных земляў, знікла амаль пятая частка прэснаводных рыб. Паводле прагнозаў эколагаў, кожная чацвёртая з найбуйнейшых рэк у свеце будзе «ўрэгуляваная» дамбамі і іншымі збудовамі ў найбліжэйшыя 15 гадоў. У Расіі толькі адна рака — Пячора — цячэ свабодна ад вытокаў да мора. «Цяпер мы не можам ацаніць шкоду ад парушэння натуральнага цячэння ракі, аднак, калі наступствы праявяцца, можа быць позна», — сцвярджаюць актывісты Сусветнага фонду дзікай прыроды.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Карэспандэнт атрымаў заданне...

...ДАПАМАГЧЫ СЛЕДСТВУ, або Што паказвае экспертыза?

Кошт аднаго даследавання ў Дзяржаўным экспертна-крыміналістычным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь можа набліжацца да кошту патрыманага аўтамабіля. Карэспандэнт «Звязды» апранула ўніформу і пранікла на адзін з доследных участкаў з тым, каб пераканацца, што велізарныя дзяржаўныя грошы расходуюцца недарма. Адказная, скрупулёзная работа экспертаў дапамагае следству ў разборы самых розных крымінальных спраў.

Старшы эксперт Юрый ВОЛАХ.

Сотні даследаванняў штодня

Журналіста цяжка чым-небудзь здзівіць: яму даводзіцца шмат дзе бываць, многае бачыць. Аднак Дзяржаўнаму экспертна-крыміналістычнаму цэнтру МУС удалося пахіснуць маю перакананасць. У цэлым яно і без лішніх слоў зразумела, што сучасная экспертыза — нешта няпростае. Аднак за некалькі гадзін знаходжання ў незвычайнай установе высветлілася: тое, чым з дня ў дзень займаюцца тутэйшыя спецыялісты, цяжка нават апісаць, — не тое, каб стаць побач з экспертам і хоць бы ўмоўна паўтарыць яго работу, як я і планавала напачатку.

Дарэчы, экспертызай ва ўсіх краінах свету займаецца шэраг розных устаноў. У нашай, напрыклад, эксперты працуюць у Дзяржаўнай службе медыцынскіх, судовых экспертыз, установах пры міністэрствах юстыцыі, абароны, пры мытні і іншых. Аднак пэўныя віды даследаванняў у рэспубліцы робіць толькі экспертна-крыміналістычны цэнтр Міністэрства ўнутраных спраў. «Філіялы» апошняга ёсць у кожнай вобласці, а ў раённых аддзелах унутраных спраў працуюць эксперты-крыміналісты. Непасрэдна на рэспубліканскі «ўзровень» трапляюць даследаванні самыя складаныя, скажам, звязаныя са смяротным зыходам.

Паводле слоў начальніка Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС Уладзіміра АЎСЯННІКАВА, традыцыйная экспертная крыміналістыка — гэта вывучэнне слядоў рук, прылад узлому, прадметаў, з дапамогай якіх былі ўчынены супрацьпраўныя дзеянні, а таксама даследаванне почырку, фальшывых дакументаў, зброі, партрэтная ідэнтыфікацыя і г.д. Ёсць экспертыза камп'ютарна-тэхнічная, бухгалтарска-эканамічная, фонаскапічная.

Спецдаследаванні — гэта ўсё, што звязана, так бы мовіць, з біялогіяй, хіміяй, фізікай і інжынерна-тэхнічнымі даследаваннямі. Кажучы простай мовай, біялогія вывучае «прадукты жыццядзейнасці» чалавека, хімія і фізіка — наркатычныя рэчывы, гаруча-змазачныя матэрыялы, каштоўныя металы, фарбы, шкло, палімеры і г.д. Да спецдаследаванняў адносіцца і экспертыза харчовых прадуктаў, у першую чаргу, вадкасцяў, якія ўтрымліваюць спірт. Што да апошніх, то сёлета аддзелу працуецца крыху спакайней, паколькі пік распаўсюджанасці «кірушак»-«максімкаў», якія карысталіся папулярнасцю сярод пэўнай катэгорыі грамадзян, прыпаў на 2007 год. Тады шмат «дэгустатараў» атрутных вадкасцяў паплацілася за сваю неразборлівасць здароўем, а нехта і жыццём. Разам з медыкамі экспертам давялося даследаваць як атрутныя вадкасці, так і іх уплыў на пацярпелых.

Адной «кроплі» мала

Пакуль я апраную ўніформу, — маску, галаўны ўбор, халат, бахілы, — каб «праваліфікавацца» ў эксперта, намеснік начальніка ДЭКЦ Святлана КРЫЦКАЯ тлумачыць, дзеля чаго выдатныя, спецыяльна падрыхтаваныя біёлагі, фізікі, хімікі выконваюць работу, за якую нясуць высокую, у тым ліку крымінальную, адказнасць. «Заключэнне эксперта — гэта дакумент, які ўкладаецца ў крымінальную справу, — тлумачыць Святлана Уладзіміраўна. — Яно служыць крыніцай доказу... Зараз вы наведаеце аддзел біялагічных і медыка-крыміналістычных экспертыз і аддзел ДНК-аналізу. Калі гаварыць у агульных рысах, то эксперты гэтых аддзелаў даследуюць любыя рэчы, якія могуць несці інфармацыю для раскрыцця канкрэтнага злачынства. З гэтай мэтай яны і дасылаюцца следчым або дазнавальнікам. Наша задача — знайсці пэўныя сляды — эпітэліяльныя клеткі, кроў або іншыя біялагічныя вадкасці на атрыманых прадметах. Калі знойдзем — будзем даследаваць і пры неабходнасці супастаўляць з біялагічнымі ўзорамі канкрэтнай падазронай асобы. Калі не будзе знойдзена ніякіх слядоў, гэта, зразумела, таксама доказ. Аднак, бывае і так, што сляды — непрыдатныя для даследавання. Яны ёсць, але «выцягнуць» з іх нічога немагчыма...».

Ходзяць чуткі, што на Захадзе спрабуюць атрымліваць крыміналістычную інфармацыю нават... з паветра. Тэарэтычна гэта не надта неверагодна. А вось практычна... Вельмі груба кажучы, для таго, каб атрымаць узор ДНК з той жа крыві, сліны, спермы, якая засталася, дапусцім, на адзенні ахвяры ці злачынцы, патрабуецца... пэўная колькасць вышэйпералічаных вадкасцяў. Часам атрымліваецца, што для досыць сур'ёзнага ланцугу даследавання выяўленага следу недастаткова. Біёлагі разумеюць, пра што ідзе размова. Астатнім жа прапаную проста паверыць на слова.

Неабходна дадаць, што на гэты момант развіццё навукі і тэхнікі ўсё ж такі дазваляе даць адказ на многія пытанні. Аб гэтым сведчаць выпадкі раскрыцця спраў нават 30-гадовай даўніны. Такім чынам, можна меркаваць, што справы, якія на сёння застаюцца не раскрытымі, могуць перастаць быць такімі праз пэўны час. Патрабуецца толькі захаваць рэчыўныя доказы, што і выконваецца пракуратурай і міліцыяй.

Клеткі на акурку

Аддзелы, у якія я накіравалася, аснашчаны на еўрапейскім ўзроўні. Без тэхнікі працэс некаторых даследаванняў мог істотна зацягнуцца. Аддзел біялагічных і медыка-крыміналістычных экспертыз і аддзел ДНК-аналізу 8-га ўпраўлення даследуюць усе віды біялагічных слядоў — эпітэліяльныя клеткі, валасы, косці, чэрапы, зубы... Ідэальны аб'ект для даследавання з пункту гледжання эксперта — той, над якім не папрацаваў ні час, ні неспрыяльнае навакольнае асяроддзе.

Вось над гэтым чэрапам час паспеў папрацаваць. Гаворка ідзе пра неапазнаны, гніласна зменены труп, які без работы эксперта не апазнаць. Мне дазваляецца далучыцца да працэсу — памацаць апрацаваную пераксам паверхню. Шурпатасці я, зразумела, «выявіла», але сказаць на падставе атрыманых ад дотыку ўражанняў, каму належаў «аб'ект» — мужчыну ці жанчыне — не змагла. «Мы павінны аднавіць агульныя рысы, форму твару так, каб сваякі здолелі апазнаць асобу, — кажа галоўны эксперт Дзмітрый ВІТУШКА. Шэраг прыкмет вызначаецца візуальна, іншыя — навобмацак. У гэтым выпадку можна гаварыць пра маладую жанчыну. На іншыя ўдакладненні спатрэбіцца некалькі дзён...».

У лабараторыю аддзела ДНК-аналізу з канцылярыі паступіла чарговая ўпакоўка рэчавых доказаў — скрыня з-пад чаю «Плод страсці», набітая, мякка кажучы, не вельмі чыстым адзеннем. Мне, як высветлілася, пашанцавала. Пасля раскрыцця некаторых падобных скрыняў па пакоі распаўсюджваецца такі смурод, што хоць святых вынось.

Даследуем першую рэч з «Плоду страсці» — нячысты пінжак светлага колеру. Відавочныя сляды адсутнічаюць. Далей аглядаем пад мікраскопам тыя месцы, дзе цела непасрэдна датыкаецца да адзення — каўнер, рукавы. Знаходзім тое, што нам трэба — эпітэліяльныя клеткі. Збіраем апошнія і «фарбуем», каб лепей адрозніць пад мікраскопам. Прыгожага фіялкавага колеру клеткі «выстройваюцца» ў стракаты малюнак...

Пакуль эксперт аглядае іншыя рэчы са згаданай скрыні, мы са старшым экспертам Юрыем ВОЛАХАМ спрабуем атрымаць клеткі са слiны, якая засталася на акурках у скрадзеным аўтамабілі. Мікраскоп паказвае, што патрэбныя нам клеткі ёсць. З іх мы будзем спачатку вылучаць ДНК. Вельмі сцісла кажучы, з дапамогай тэхнікі і рэактываў — адлучаць ДНК ад астатніх кампанентаў. Потым — ампліфікацыя. Падчас гэтага працэсу павелічэння копій малекул ДНК з адной можна атрымаць велізарную колькасць. Пасля ампліфікацыі — электрафарэз, канчатковы этап даследаванняў. Для гэтага патрабуецца сіквінатар.

На фінішнай прамой

— Сіквінатар — генетычны аналізатар, які дапамагае даведацца аб паслядоўнасці і структуры ДНК, — тлумачыць галоўны эксперт Дзмітрый МАРКОЎКА. — Тут мы атрымліваем лічбавую і графічную інфармацыю. Яна будзе ўнікальнай, паколькі вядома, што ў кожнага чалавека — свой набор ДНК. У выніку мы вызначым 16 прыкмет даследавання. Пры гэтым атрыманыя звесткі не будуць мець нічога агульнага з умяшаннем у асабістае жыццё чалавека, паколькі яны не раскрываюць такіх асаблівасцей індывідуума, як схільнасць да спадчынных захворванняў і г.д... Апрацоўка звестак будзе доўжыцца да вечара, так што вынік будзе гатовы толькі заўтра, калі, нарэшце, нас чакае самае складанае — прааналізаваць атрыманы вынік, інтэрпрэтаваць зразумелым чынам для таго ж следчага ці адваката...

Канчатковы дакумент, дзеля якога старанна працавалі прафесіяналы і дылегаваны рэдакцыяй дылетант — уласна заключэнне эксперта — напісаць мне, натуральна, не даверылі. Толькі паглядзець, як гэта выглядае: прозвішча эксперта, папярэджанне аб крымінальнай адказнасці (за адмову выканання ці дачу хлуслівага заключэння), дата пачатку і завяршэння работы, стаж працы, хто вынес пастанову, кароткая фабула справы, апісанне рэчавых доказаў, з дапамогай якой методыкі даследавалі... Афармленне выніку...

P.S. *У найбліжэйшыя дні следства атрымае апісанне ДНК двух падазроных, якія ўкралі аўтамабіль.*

Святлана БАРЫСЕНКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Галоўны эксперт Дзмітрый ВІТУШКА.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: **лот 1** — земельный участок в а/городке Раков, площадь участка — 0,1532 га, кадастровый номер 622085715641000005, начальная цена 15 320 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости газ; **лот № 2** — земельный участок в деревне Дубоши, площадь участка — 0,1561 га, кадастровый номер 622085705601000043, начальная цена 7 805 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **17 апреля 2009 года** в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **14 апреля 2009 года** (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактный телефон (8 01772) 52 2 36.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Острошицкого сельисполкома

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Логойском районе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по документации (бел. рублей)
1	аг. Острошицы, уч. № 1, 623286306601000297	0,1201	в непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения	2 932 000	290 000	1 396 714
2	д. Метличино, уч. № 3, 623286305101000037	0,1519	сети электроснабжения	863 860	85 000	1 290 600 (по каждому лоту)
3	д. Метличино, уч. № 4, 623286305101000038	0,1518		863 290	85 000	
4	д. Панышевщина, уч. № 1, 623286307101000063	0,1536		873 530	85 000	
5	д. Панышевщина, уч. № 2, 623286307101000064	0,1535		872 960	85 000	
6	д. Веснино, уч. № 2, 623286301101000056	0,1116	сети электроснабжения, водоснабжения	825 070	80 000	

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **21.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 15 апреля 2009 года АУКЦИОНА

по продаже объекта недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи равной одной базовой величине

ЛОТ № 1

База отдыха «Борец»:

медпункт (инв. № 310/С-27383), овощехранилище (инв. № 310/С-27386), биллиардная (инв. № 310/С-27385), здание корпуса (инв. № 310/С-27377), здание корпуса (инв. № 310/С-27379), здание корпуса (инв. № 310/С-27380), здание корпуса (инв. № 310/С-27381), столовая (инв. № 310/С-27382) в пос. Борец Гомельского района Гомельской области и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здания щитовые и кирпичные, общей пл. 1015,74 кв.м.

Местонахождение: Гомельская область, Гомельский район, пос. Борец.

Условия использования – для культурно-оздоровительного и социально-гарантированного обслуживания.

Земельный участок – 3,6857 га. Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ – 0,3133 га; водоохранная зона реки Сож вне прибрежной полосы – 3,6857 га.

Срок аренды земельного участка 49 лет.

Условия аукциона:

осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 3 лет с момента заключения договора купли-продажи,

создание не менее пяти дополнительных рабочих мест,

запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Начальная цена единого предмета аукциона – 6 243 468 руб., в т.ч. имущества – 280 000 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 5 963 468 руб.

Задаток, вносимый участником, – 600 000 рублей.

Продавец: имущества – ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3, тел. (0232) 36-12-92, права заключения договора аренды земельного участка – Гомельский райисполком, г. Гомель, ул. Ильича, 51а, тел. (0232) 36-41-33.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны (0232) 74-90-27, 70-14-72.

Аукцион проводится 15 апреля 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, 5 этаж, каб. 501. Документы для участия в аукционе принимаются до 13 апреля 2009 г.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 и Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 13 апреля 2009 г. заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка за участие в аукционе, на счет организатора аукциона, указанный в извещении; нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с н

ЛАДАРАЖ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мы мінаем не проста вёску — этнаграфічны музей. Крыжы-ахоўні, пуні і некалькі хат з саламянымі стрэхамі, лодкі, стагі сена і стагі дроў, буслянкі на стрэхах і слупах. «Калі на страсе ёсць буслінае гняздо, хаце не пагражае маланка, — прыгадвае Уладзімір Іванавіч мясцовае павер'е. — Гэта шчаслівая хата». Я імкнуся ўявіць тутэйшы вясновы краявід, калі вяртаюцца з выраю чароды буслоў і паветра ажно шуміць ад птушыных крылаў. Во дзе трэба развіваць айчынны аграгурызм! Вось куды трэба ехаць і арнітолагам, і этнографам, і фальклярыстам таксама. Бо Ладараж яшчэ захоўвае сваю багатую песенную спадчыну, а мясцовыя спявачкі-бабулі вядомыя не толькі на Пяншчыне. Пра іх я ведаў крыху раней. Летась давялося патрапіць на канцэрт аўтэнтычнай палескай песні, дзе выступаў і гурт «Ладаражанка». Гледачы «фанацелі» ад жывых галасоў, строяў, дыялекту. Пазней бачыў іх сярод удзельнікаў абласнога каляднага фестывалю, пераканаўся — сапраўдныя артысты гэтыя гаспадыні шчаслівых хат пад буслінымі гнёздамі. Наогул, Ладараж нават не музей — запаведнік. Уявіце сабе малюнак з сучаснага вясковага жыцця: па восені ў вёсцы з'яўляецца воз з ганчарнымі вырабамі — гаршчкамі, глечыкамі і гладышамі, макотрамі, спарышамі. Гэта майстар са Столінскай вёскі Гарадная, дарэчы, няблізкай адсюль, прыехаў абменьваць свой тавар на бульбу. За адзін гляк ён бярэ кош бульбы. «Бабы, кушняры і краўцы!» — заклікае вясковых жанчын ганчар-гандляр. У Ладаражы «гаршаі» не ляпілі, бо не тая глеба, а былі скарнякі і шаўцы, кажуховых спраў майстры. На жаль, промысел гэты аджыў сваё. Але ёсць вясковы ўмелец з аўтарытэтам выдатнага майстра. Гэта Іван Носка, спецыяліст па вырабе лодак, санак і паўсанак, вазоў, вёслаў, бондарскага посуду. Шые хамуты і кладзе печы. Яму робяць заказы нават з-за мяжы. Па Стыры плаваюць ягоныя «дубы», а коней запрагаюць у носкавыя калёсы. А што ўжо казаць пра звычайныя кошыкі, ці, як па-мясцоваму кажуць, «кашалыкі». А колькі святаў было, гульняў, традыцый і абрадаў!

Год пачынаўся Раством і Шчодрыкамі. Пад вокны прыбягалі дзеці: «Дзядзько, ці можно поколядоваты? Дай Божэ, каб за год дождалы». «Колядуйтэ»,— адказваў гаспадар. «Колядын, колядын, я ў бацькі одын...»

На масленіцу ў Ладаражы каталіся на санках, а на «паласказуба» — першы дзень посту — частавалі сырам. На сыраркі да сустрэчы вясны выпякалі птушачак, хлопчыкі кідалі праз страху трэскі. Трэба было кінуць ажно сорак трэсак, каб потым знайсці сорак птушыных яек. На балотных купінах малыя палешукі шукалі яйкі дзікіх качак. На Юр'я, калі першы раз выганялі ў поле жывёлу, пастушкам давалі пірагі. А вось на Тройцу ў хатах на падлогу абавязкова клалі «лэпэх» (аер) і «вадзілі куста». «Куст» — як сімвал роду, быў асноўны абрад усёй вёскі. Потым прыходзілі зажынкі і на покуць ставілі першы сноп. На жаль, усё гэта можна пералічваць толькі ў мінулым часе. Калі б абрады і святы захаваліся ў сваім першасным выглядзе і ў Ладаражы, і ў іншых куточках Палесся, наша краіна магла б прэтэндаваць на бясспрэчную ўнікальнасць. Але я трапляю ў палон іншых думках: ці не апошнія носьбіты бясцэннага скарбу дажываюць сёння свой век у Ладаражы? Моладзі амаль не засталося, няма каму несці тутэйшую самабытнасць. Цяпер, каб падняць магутны пласт народнай культуры, які, аднак, знікае, дзяржаве трэба прыкласці неверагодныя намаганні. На Ладаражы з яго і матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчынай, падобна, даўно пастаўлены крыж.

Дарэчы, пра крыжы. Ладаражскія крыжы надзвычай старажытныя і маюць сапраўдную культурную і гістарычную каштоўнасць. Гэта — святыні. Асабліва адзін абракальны крыж на могілках. Ён не знік нават у самыя атэістычныя часы і да сёння не страціў патрэбы ў людзей. Верагодней за ўсё, крыж з'явіўся з прыходам хрысціянства, на змену паганскім камяням, бо агульнавядома, што аброкі — традыцыя дахрысціянская.. Апошні выпадак, калі абракалася ўся вёска, адбыўся ў Ладаражы 52 гады таму, калі маланка забіла дзвюх сясцёр. Матулі абракаліся за сваіх дзяцей, за свой дом, нават за жывёл.

— «І цяпер штогод на Пятра і Паўла ўсе збіраюць аброк і нясуць у царкву. Маланак стала менш, — кажа Уладзімір Паляйчук.

У сваёй вёсцы ляснік ведае кожнага жыхара, лёс кожнай сям'і. Па-першае, кожны гаспадар ідзе да яго па дровы. Хто сам іх нарыхтоўвае, каму трэба прывезці. Жонка Тамара — работнік клуба, бібліятэкар і староста населенага пункта, і ў іхнім доме рэдка зачыняюцца дзверы і маўчыць тэлефон. Насельніцтва ў Ладаражы пенсійнае, адпаведныя ў яго і праблемы: пенсіі, здароўе, догляд старых, хуткая дапамога, рэйсавы аўтобус, тавары штодзённага попыту, дровы. Не надта вясёлы твар сёння ў вёсцы: праз адну стаяць пустыя хаты, ці жывуць у іх адзінокія. На вуліцы дзіцячых галасоў не пачуеш, хіба ўлетку ў час канікулаў. Нельга сказаць, што жыхароў тут мала, усё ж такі 220 чалавек, але гэта — рэшткі былой раскошы. Раней не ведалі, каму працу даваць і як ад ахвотных адбіцца, цяпер працаваць няма каму. Пальцаў рук хопіць пералічыць працаздольных.

— Раней у нас быў перадавы калгас «Ударнік», жывёлы было 2000 галоў, даяркі ў чарзе па працу стаялі. А як з «Маяком» аб'ядналі, усё змянілася», — не без крыўды кажа мой спадарожны.

Калі не лічыць вайну, тры асноўныя хвалі пад корань касілі Ладараж. Па-першае меліярацыя ў 1968 годзе балюча ўдарыла па навакольным асяроддзі і, «вызваляючы» палешука з балота, моцна змяніла лад яго жыцця. Як высветлілася пазней, не да лепшага. Але гэта паўбяды. Вось калі ў Пінску пабудавалі трыкатажны камбінат, моладзь з вёскі знікла, нібы пасля чумы. Тэндэнцыя адтоку моладзі працягваецца па сёння, гэтаму актыўна дапамагае радыяцыйнае чарнобыльскае забруджванне, а яно дасягае тут ад 5 да 15 кюры.

— Першыя дзесяць гадоў нам плацілі «грабавыя», — узгадвае ляснік. — Цяпер не, напэўна, лічаць, што радыяцыя нам на карысць.

Наўздагон яшчэ адзін удар: у 2008 годзе ў Ладаражы зачынілі школу. Тлумачэнне даволі распаўсюджанае — мала дзяцей. І гэта ў вёсцы, дзе некалі быў свой радзільны дом. І вось парадокс. У Іванчыцах, усяго ў сямі кіламетрах, толькі на ўкраінскім баку, у гэткай жа, як Ладараж, вёсцы, на гэтай жа рацэ Стыр, не менш пацярпелай ад Чарнобыля, у году ў год адбываецца прырост насельніцтва. У Ладаражы — скарачэнне. У чым прырода неверагоднай розніцы двух памежных насельных пунктаў? Можа ў іх аддаленасці ад райцэнтраў. Ладараж — адзін з самых аддаленых у Пінскім раёне, Іванчыцы ў сваім Зарэчненскім — самы блізкі.

Ад Ладаража да мяжы з Украінай ад сілы пяць кіламетраў. Цяпер гэта лесніковы абход. Уладзімір хоча паказаць мне сваё любімае дрэва, якое ён лічыць сапраўдным помнікам прыроды, а яно расце якраз каля мяжы. Ехаць мне туды небяспечна, але я згаджаюся, бо калі яшчэ такая магчымасць выпадзе? Прыгожая марозная раніца, надзейны транспарт. Сёння толькі пракаціцца на санках, лічы, аграгурызм. Спачатку дарога ўецца сярод Чарнітава балота, потым знікае пад снегавым покрывам. Толькі мясцовы жыхар можа яе дакладна адчуваць. Ужо некалькі гадоў па гэтай дарозе, акрамя лесніка, грыбнікоў і ягаднікаў ніхто не ездзіць. Нават не верыцца, што для вяскоўцаў зусім нядаўна яна была сапраўднаю «дарогаю жыцця».

— Да нашага райцэнтра — Пінска — 60 кіламетраў, да Століна столькі ж, а да Зарэчнага ва Украіне ўсяго пятнаццаць, — тлумачыць ляснік і дадае: — але ўжо тры гады, як мяжа «на замку» і нават суседнія Іванчыцы нам забаронена наведваць.

Акрамя базару, жыхары Ладаража на ўкраінскім баку мелі патрэбу ў медыцынскім абслугоўванні, наведвалі бальніцу, везлі ў рамонт бытавую тэхніку. Што датычыць роднасных, свояцкіх і проста сяброўскіх сувязяў — гэта асобная і надзвычай балючая тэма. Раней што ні вяселле — ці малады з Украіны, ці маладая. Вясковы гарманіст Аркадзь Курадовец быў гарманістам больш як на паўтысячы вяселлях, у тым ліку і інтэрнацыянальных. Хто пра межы тады хваляваўся? Цяпер паспрабуй сунься напрасткі ў Іванчыцы, схопіш ад пагранічнікаў штраф як мінімум тысяч семсот. Апошні выпадак Уладзімір Паляйчук запомніць надоўга. Паехаў неяк з суседам на кані на кірмаш парасят купляць. Карацейшай дарогай, як заўсёды. І парасят купілі, і знаёмых пабачылі, колькі радасці было сустрэцца! А як вярталіся дадому, украінскія памежнікі ім: стоп, дакументы на праезд! І за парушэнне пагранічнага рэжыму — пад арышт. Некалькі дзён трымалі, забралі парасят, каня, воз. Жонка дома трывогу падняла — мужык прапаў, вядомы на ўсю акругу ляснік, да таго ж адзначаны граматай міністра пагранвойскаў за дапамогу па ахове дзяржаўнай мяжы. Вярнуўся Уладзімір самаходам, праз пагранпераход, з пустымі кішэнямі. Праўда, каня і калёсы пазней вярнулі. Вось табе і суседзі. Раней і на конях, і пешкі дабіраліся, а ў вясновыя разлівы і на маторках, і катэрам па Простыры. Да 1975 катэр хадзіў, «лапаць» называлі. Пра гэта жыхары цяпер толькі ўздыхаюць, бо як пагадзіцца ім з абмежаваннем паляшуцкай вольніцы? Іван Носка зрабіў для знаёмага ўкраінца і калёсы, і санкі, а заказчык не едзе ўсё па той жа прычыне — напрасткі нельга, у аб'езд далёка і падатак вялікі трэба мытні плаціць.

Лесніковы абход у Палейчука вялікі, замест патрэбных 600 гектараў ён ахоўвае ў два разы больш. У лесе ёсць участкі, дзе радыяцыя літаральна «зашкальвае», там перыядычна вядуцца замеры, але лепей тыя месцы абмінаць. Колішнія ўрадлівыя глебы за Чарнітавым балотам цяпер зарастаюць хвойнікам. Тут каласілася ладнае жыта. Некалі продкі літаральна адваёўвалі зямлю. Цяпер прырода вяртае сваё назад, робіць гэта хутка, змяняючы краявід, не пакідаючы дарог. Зімою лягчэй дабрацца да любога балотнага і лясного куточка і, паблукаўшы між бяроз і вольхаў, мы нарэшце спыняемся. Яшчэ некалькі хвілін пятляем па снезе — і вось ён, унікальны аб'ект прыроды: сіямскія блізняты лесу. Дубы, якім гадоў пад сорак, зрасліся адной галінай, быццам у іх на двух адна рука. Ляснік адкрыў гэты цуд нядаўна і відавочна хвалюецца, як ураторваць дубы, захаваць для нашчадкаў. Бо ў лесе здараюцца несанкцыянаваныя высечкі гасцей-нелегалаў з суседняй краіны. Што для іх прыгажосць, альбо з'ява прыроды?! Адно дрэва часам захаваць куды цяжэй, чым цэлы лес.

Зрабіўшы фотаздымак лесніка ў дрэвах, вяртаемся на свой санны след, каб яшчэ да захаду сонца працягнуць ладаражскі фоталетапіс. Без фотаздымкаў маіх уражанняў будзе недастаткова. А фотаздымкам патрэбен каментарый. Вось паміж дзвюх Надзей сядзіць з гармонікам Аркадзь Курадовец, колішні ўдзельнік гурта «Ладаражанка», а Надзеі — жонка і суседка і дагэтуль спяваюць і выступаюць. Цікавую фразу сказаў пра сябе Аркадзь Лукіч: «Каб пераняць, (навучыцца) іграць польку, пешкі хадзіў да настаўніка ў Пінск». Цяпер толькі ён можа сыграць польку ладаражскую і польку іванчыцкую. Дванаццацігадовая школьніца Ліза Клімушка нарадзілася ў Століне, а жыве ў Ладаражы. Яна з ахвотаю спявае і ў школьным хоры, і ў вясковым клубе. Уся надзея, што мясцовы фальклор не загіне — на яе. Ліза, як сапраўдная мадэль пазіравала перад фотакамерай у ладаражскім строі. Старастай вёскі жыхары аднагалосна абралі маладзейшую за сябе Тамару Паляйчук і цяпер з любым пытаннем — да яе. Фальклорны гурт «Ладаражанка» — вясковы брэнд, з вялікім поспехам яны выступілі ў сталіцы і патрапілі на фота і відэастужкі. Самым маленькім жыхарам Юліі Дзямчук і Ангеліне Санчук пакуль што зусім не цесна ў адных санках. Кім яны стануць, калі вырастуць?

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара. *Пінскі раён.*

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ ЛОГОЗИНСКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Логозинского сельсовета:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие ограничений в использовании земель	Расходы по подготовке документации	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Добренево, участок № 27, 623284501101000092	0,1171 га	—	1 410 714 руб.	2 342 000	230 000
2	д. Добренево, участок № 29, 623284501101000093	0,1230 га	охранная зона ЛЭП напр. свыше 1000 вольт (0,0048 га)	1 410 714 руб.	2 460 000	240 000
3	д. Зеленый Сад, участок № 1, 623284501601000035	0,2500 га	охранная зона ЛЭП напр. 380 вольт (0,0070 га)	1 410 714 руб.	6 250 000	625 000
4	д. Зеленый Сад, участок № 2, 623284501601000036	0,2500 га	—	1 410 714 руб.	6 250 000	625 000
5	д. Логоза, 623284502601000152	0,2500 га	водоохранная зона реки Логозинка (0,2500 га)	1 290 604 руб.	7 500 000	750 000
6	д. Селище, участок № 1, 623284505601000025	0,1367 га	—	1 410 714 руб.	2 734 000	270 000
7	д. Селище, участок № 2, 623284505601000024	0,2500 га	охранная зона ЛЭП напр. свыше 1000 вольт (0,0665 га)	1 410 714 руб.	5 000 000	500 000

В непосредственной близости от участков имеются сети электроснабжения, водоснабжения. Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.04.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Рэпартаж з колаў

МЫ РАДЫ ЗА ВАС

ЗВЯЗДОЎСКІЯ РЭКОРДЫ — НА КАРЫСЦЬ ПАДПІСЧЫКАМ

Тэлевізар ад "Звязды" нашай чытачцы ўручае начальнік аддзела ідэалагічнай работы ЧАЧЭРСКАГА райвыканкама Ганна МАЛАЛЕТНІКАВА

Праехаць за адзін раз па тэрыторыі чатырох абласцей Беларусі, дзе жывуць падпісчыкі «Звязды», нам, даводзілася і раней. А вось укласці ў двухдзённы ваяж па рэспубліцы яшчэ і парачку-тройку сустрэч у падтрымку найстарэйшага беларускамоўнага выдання — гэта ўжо з вобласці рэкордаў. Тым не менш у адзін з апошніх агітацыйных выездаў супрацоўнікам газеты дабіцца гэтага ўдалося.

Галоўны візіт быў скіраваны на Гомельшчыну ў горад Чачэрск, дзе наш каляровы тэлевізар «Віцязь» ужо зачакалася жыхарка раёна Раіса Шаўчук. Не ведаем, ці верыла яна ў тое, што галоўны прыз да яе прыбудзе да канца падпісной кампаніі на 2-гі квартал 2009 года, як мы і абяцалі, але ляцелі на сустрэчу з чытачамі «Звязды» ў прыгранічча Беларусі з Расіяй поўным ходам. Праўда, па дарозе неаднаразова ўспаміналі не самым добрым словам адказных супрацоўнікаў адпаведных службаў, што эканомяць на дарожных знаках, з-за чаго можна рэальна збіцца з намечанага маршруту. Падчас такіх выездаў па-асабліваму ставішся і да жыццёва-філасофскага выразу рускага класіка Мікалая Гогаля наконт двух бедаў, якія характэрныя для нашай Усходняй суседкі. Адна з іх — гэта дарогі. Не ведаю, наколькі цяпер актуальная тэма якаснага дарожнага пакрыцця для Расіі, але для Беларусі — дакладна. Бясконцыя калдобіны, ямачны рамонт, звужэнні трасы, высунутыя наверх каналізацыйныя люкі...

Тым не менш гэтыя абставіны не пашкодзілі нам напачатку «выйсці ў людзі» ў Мар'інай Горцы, Асіповічах, Бабруйску, Жлобіне, Рагачове... Кантакты з кіраўніцтвам мясцовай «вертыкалі» і пошты, паштальёнамі і падпісчыкамі дапамаглі «асвяжыць» рэальную карціну ў плане інфармавання насельніцтва. Яшчэ раз упэўніліся — мы на правільным шляху.

З такімі светлымі думкамі мы прыбылі на сустрэчу ў Чачэрскі райвыканкам. Дзякуй мясцовым ідэолагам і намесніку начальніка РВК Пятру Несцяровічу — іх аптымістычны настрой паўплываў на аўру вялікай залы, дзе сабралася з паўсотні «слухачоў». Адпаведны настрой сваім землякам, якія сёлета адзначаць 850-годдзе Чачэрска, надала і звяздоўская лаўрэатка Раіса Варфаламееўна Шаўчук. Яна прызналася, што «Звязду» выпісвае не такі працяглы час, як некаторыя, але паспела палюбіць, бо на яе старонках ёсць што пачытаць, шмат добрых жыццёвых парадаў. Ну а калі яшчэ пашанцавала з выйгрышам буйнога прыза, то «галасуе» перад сваімі землякамі за «Звязду» абедзвюма рукамі...

Паштальён Тамара ШЫРОКАЯ — адна з тых, хто прыносіць газету "Звязда" ў дамы жыхароў Бабруйска.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Мінск—Мар'іна Горка—Асіповічы—Бабруйск—Жлобін—Рагачоў—Чачэрск—Гомель—Калінкавічы—Мазыр—Петрыкаў—Лунінец.

(Заканчэнне будзе.)

У зале падчас сустрэчы звяздоўцаў з жыхарамі Чачэрска.

«Еўрабачанне-2009»

ЯК ФАНЕРА НАД МАСКВОЮ

Грузія памахала ручкай, не павітаўшыся

Да злёту ўдзельнікаў у Маскву яшчэ два месяцы, такіх доўгатэрміновых прагнозаў надвор'я сіноптыкі пакуль што не робяць. Але сакавік для «Еўрабачання» выдаўся надзіва спякотным. Не паспелі адшумець страсці з выбарам канкурсанта ад Расіі, як выбухнуў яшчэ адзін скандал: Грузіі забаранілі ўдзельнічаць у конкурсе.

Бз-з і тс-с!

У адрозненне ад скандальнага выступлення Веркі Сярдзючкі са спрэчным ці то «Лаша тумбай» ці то «Раша, гудбай», тут абурыліся ўжо не расіяне, а Еўрапейскі вяшчальны саюз. Дакладней, яго прадстаўнікі прапанавалі змяніць тэкст песні «We don't wanna put in», назву якой можна перакласці як «Мы не хочам Пуціна». І хоць самі выканаўцы, гурт «Стэфане і 3G», сцвярджаюць, што ў тэксце няма палітычнага падтэксту, а «put in» перакладаецца як «выказаць негатыўныя дзеянні», але большасць слухачоў чуе і разумее менавіта так. А па правілах «Еўрабачання», тэксты і назвы песень не могуць несці ніякага палітычнага падтэксту, інакш артысты будуць дыскваліфікаваныя. Якія штрафныя санкцыі ў сувязі з гэтым чакаюць Грузію, стане вядома на сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый краін — удзельніц конкурсу, якая адбудзецца ўжо 16—17 сакавіка. Але ўжо зразумела, што калі абаяльнае дзіцячае трыо са сваім музычным «бз-з» выклікала агульнае захапленне (і перамагло на дзіцячым «Еўрабачанні»), то цяпер грузінскія артысты пачуюць хіба «тс-с!».

Выпасці са спісу ўдзельнікаў можа і Бельгія — калі аргкамітэт прыме да ўвагі скаргу фанатаў Элвіса Прэслі, якія лічаць, што тэкст песні абражае памяць караля рок-н-ролу.

Толькі без фокусаў

Літаральна некалькі дзён засталося і ў беларускага ўдзельніка Пятра Елфімава, каб падаць кліп на сваю конкурсную песню «Eyes that never lie». Менавіта таму спявак цяпер знаходзіцца ў Кіеве, дзе над сюжэтам чаруе знакаміты рэжысёр-пастаноўшчык Сямён Гораў — вядомы гледачам, напрыклад, па мюзіклах «Вечары на хутары каля Дзіканькі», «Папялушка», «Сарочынскі кірмаш», а таксама па леташняй рабоце для Руслана Аляхно. Да распрацоўкі сцэнічнага нумару таксама прыцягнуты прафесіянал — польскі рэжысёр Януш Юзэфовіч, які ставіў мюзіклы «Прарок», «Іствікскія вядзьмаркі», «Метро». Сама пастаноўка трымаецца ў сакрэце, але, як расказала прадзюсар спевака Таццяна Касмачова, адну з пастаўленых задач вырашае прафесійны ілюзіяніст, так што ад Пятра ў Маскве, акрамя шырока разрэкламаваных белых скураных штаноў, цалкам можна чакаць якіх-небудзь фокусаў.

Іх жа збіраецца прадэманстраваць публіцы ўкраінская канкурсанта Святлана Лабада, якая заявіла нядаўна, што мэта яе выступлення — не заняць першае месца, што ўжо ўдавалася Украіне, але здзівіць і запомніцца ўсяму свету. «Гэта будзе найлепшае выступленне і неверагодныя дэкарацыі, у нас хапае сілаў і фантазіі для гэтага», — абяцае спявачка.

Нарэшце, пэўных эфектаў ілюзіёну варта чакаць ад балгарскага ўдзельніка Красіміра Аўрамава — хоць бы таму, што яго конкурсная песня ў стылі «поп-опера» так і называецца, «Illusion». Дарэчы, у Балгарыі выбар выканаўцы таксама адбываўся са скандалам.

Увогуле, запомніцца і спадабацца ўжо цяпер удзельнікі стараюцца самымі рознымі спосабамі: Расія робіць стаўку на касмапалітызм і двухмоўную песню Канстанціна Меладзе, Францыя прыкрываецца імем Патрысіі Каас, Вялікабрытанія пакажа песню, напісаную знакамітым Эндру Лойдам Уэберам... Чый ход будзе выйгрышным — убачым у маі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Бяседныя песні

Люба

Песня «Люба» Алы ФІЯЛКОЎСКАЙ і Якава НАВУМЕНКІ гучыць з выклікам, успрымаецца як пароль для знаёмства. Яна арганічна ўваходзіць у бяседную канву, стварае даверлівую атмасферу.

Звычайна на бяседзе спеўны тон задаюць мілыя сяброўкі. Для іх і вакальных твораў напісана больш, амаль усе душэўныя перажыванні імі можна перадаць. Таму новая мілагучная песня для юнакоў — падарунак для ўсёй грамады. Бо яна для агульнай радасці, весялосці, уцехі.

Тэмпераментна гучыць песня «Люба» ў выкананні аднаго з яе аўтараў. Якаў Навуменка — адметны спявак. Многія беларускія вакальныя творы выйшлі ў свет у яго афармленні. Але ж артыст часта выступае і як кампазітар, актыўна супрацоўнічае з беларускімі паэтамі. Сумесна з Алай Фіялкоўскай напісаў вельмі задушэўныя песні «Светлая замова» і «Арабінавы сум», якія вельмі цёпла прыняты моладдзю.

Верш Алы ФІЯЛКОЎСКАЙ
Музыка Якава НАВУМЕНКІ

Ў маіх думках несулад,
Сэрца кволіцца,
Эх, была ты не была,
Мая вольніца.
Аддаю цябе назад,
Не паклічу я
За дзявочую красу
Таямнічую.

(Прыпеў.)
Люба, Люба, Люба,
Любая мая.
Прыгажэй на свеце
Не сустрэну я.
Люба, Люба, Люба,
Не знайду яшчэ
Ні такой усмешкі,
Ні такіх вачэй.

А сябры мае адно
Толькі сварацца.
Кажуць — буду сумаваць,
Буду каяцца.
У мінулае шляхі
Раздарожаны.
Я паглядам дарагім
Заварожаны.

(Прыпеў.)

Як падасць сваю руку
Мая суджана,
Велічальную спяюць
На заручынах.
Замілуецца душа,
Заспакоіцца.
Эх! Была ты не была,
Мая вольніца!

(Прыпеў.)

Падрыхтаваў
Міхась ШАВЫРКІН.

ГОРАДЗЕЦ СТАРАЖЫТНАЙ КУЛЬТУРЫ І ТАЛЕНАВІТЫХ, РУПЛІВЫХ ЛЮДЗЕЙ

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь УНІТАРНАМУ ПРАДПРЫЕМСТВУ «ІНСТЫТУТ ГРОДНАГРАМАДЗЯНПРАЕКТ» за ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і забеспячэнне на гэтай аснове выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі прысуджана Прэмія Урада РБ за дасягненні ў галіне якасці 2008 года.
КАРЭСПАНДЭНТЫ «ЗВЯЗДЫ» СУСТРЭЛІСЯ З КІРАЎНІКАМІ І СПЕЦЫЯЛІСТАМІ ІНСТЫТУТА.

«МЫ — ДОЙЛІДЫ, У САМЫМ ВЫСОКІМ ЭНСЕ ГЭТАГА СЛОВА»

Расказвае дырэктар інстытута Уладзімір ДЗЯШКО.

— Перш-наперш задача любога кіраўніка — стварэнне калектыву аднадумцаў. Мы паставілі для сябе мэтай дабіцца, каб інстытут працаваў як адзінае цэлае і быў менавіта сучасным ад- надумцаў. Якая ўсёадмоўна разумее, што мы не толькі праектны інстытут, але і інжынірынгавая фірма. Не проста праекцыроўшчыкі, а дойлды. Такі калектыў сёння стварылі, ён разлюбіў абʼекты ад задумкі, ад ідэі да ўводу ў эксплуатацыю.

Неабходнае даступлення. З 2002 года, пасля прыходу Уладзіміра Іосіфавіча ў інстытут — дарэчы, з пасады намесніка міністра архітэктуры і будаўніцтва — Гродназграмадзянпраект» нечакана для калег прыйшоў на сябе яшчэ і клопатлівы абавязак вывучаць на цэлыя шэраг абʼектаў, якія праектаваў. Такой практыкі ў Беларусі не было і на той час, няма яе, акрамя як у Гродне, і зараз.

Што зна дае інстытуту? Ён не толькі выконвае праект, але і сам заключае дагаворы і генпадрадчык і падрадчыкі арганізуецца, суправаджае будаўніцтва, ажыццяўляе аўтарскі і тэхнічны нагляд да самай здачы абʼекта. Як адказны выканаўца, мае магчымасць выраша ць усе пытанні комплексна, аператыўна ўдзельнічаць на працэ і якасна яго кантраляваць. Бо рычагі кіравання скансцынтравны ў яго руках, і канкрэтныя выканаўцы ўжо не могуць бясконца спасылацца адзін на аднаго.

Што гэта дае інвестару, хто б у гэтай ролі ні выступаў — бюджэтная арганізацыя, дзяржаўны орган ці прыватнік? Упэўненасць у тым, што тэрмінны будаўніцтва будуць макс мальна сцісламі, кладзенне сродкі расходуюцца кваліфікавана і эфек тыўна, якасць ра бот — высокая. Яму, інвестару, пры емна мець справу з адным гаспадаром, які вы конвае яшчэ і функцыю генпадрадчыка, і якраз усяго ажаклівасці па на быцці абсталявання, ман тажы і здачы яго ў эксплу атацыю, на баланс. Адным словам, увядзе аб'ект у комплексе «пад ключ».

Па такой схеме ў Гродне пастаянна ўзведзена шведская фабрыка ў свабодная эканамічная зоне, пабудаваны транспартная развязка ў цэнтры горада, патрэбная абласному цэнтру як пастарта, мост цераз Гарадзічанку з падыходамі, а зусім нядаўна праведзе-на «развязкаццяная» ркана-струкцыя цэнтральнага моста праз Нёман і ажыц-ццёўлены шэраг інших суч'-ёзных праектаў.

— Колькі дзень інстытут «жыве» аб'ектам, адказнасць за які ён прымаў на сябе, а не дзённае на прыняцце — «навалівай» і забыві, — працягвае свой аповед Уладзімір Іосіфавіч. — Дэманстрацыя зусім іншая адказнасць, зусім іншы падыход. І гэта ўжо праўленне сапраўдная дойлідства, уласцівага многім слынным майстрам мінулага. У Гродне захавалася вельмі многа зроблі такога высокага архітэктурнага майстэрства, нам ёсць з кагo браць прыклад.

Для гэтага трэба пастаянна вучыцца, тым больш што калектыў імклівa расце, папаўняецца маладымі кадрамі, за апошні час мы прынялі на працу каля 200 новых супрацоўнікаў. А молады трэба выхоўваць і ў прафесійным, і ў агульначалавечым сэнсе, і задача становіцца скарочаны ў разы (у тры з палавай, у чатыры), на іх атрыманы значна нарошчаздадачы эфект.

Сваю эвышздачу як кіраўніка бачу яшчэ і ў тым, каб забяспечыць магчымасць перспектывы для інстытута. Вось галоўная прычына таго, чаму мы сталі турнага майстэрства, нам ёсць з кагo браць прыклад.

Для гэтага трэба пастаянна вучыцца, тым больш што калектыў імклівa расце, папаўняецца маладымі кадрамі, за апошні час мы прынялі на працу каля 200 новых супрацоўнікаў. А молады трэба выхоўваць і ў прафесійным, і ў агульначалавечым сэнсе, і задача становіцца скарочаны ў разы (у тры з палавай, у чатыры), на іх атрыманы значна нарошчаздадачы эфект.

Сваю эвышздачу як кіраўніка бачу яшчэ і ў тым, каб забяспечыць магчымасць перспектывы для інстытута. Вось галоўная прычына таго, чаму мы сталі турнага майстэрства, нам ёсць з кагo браць прыклад.

Для гэтага трэба пастаянна вучыцца, тым больш што калектыў імклівa расце, папаўняецца маладымі кадрамі, за апошні час мы прынялі на працу каля 200 новых супрацоўнікаў. А молады трэба выхоўваць і ў прафесійным, і ў агульначалавечым сэнсе, і задача становіцца скарочаны ў разы (у тры з палавай, у чатыры), на іх атрыманы значна нарошчаздадачы эфект.

Сваю эвышздачу як кіраўніка бачу яшчэ і ў тым, каб забяспечыць магчымасць перспектывы для інстытута. Вось галоўная прычына таго, чаму мы сталі турнага майстэрства, нам ёсць з кагo браць прыклад.

Для гэтага трэба пастаянна вучыцца, тым больш што калектыў імклівa расце, папаўняецца маладымі кадрамі, за апошні час мы прынялі на працу каля 200 новых супрацоўнікаў. А молады трэба выхоўваць і ў прафесійным, і ў агульначалавечым сэнсе, і задача становіцца скарочаны ў разы (у тры з палавай, у чатыры), на іх атрыманы значна нарошчаздадачы эфект.

Сваю эвышздачу як кіраўніка бачу яшчэ і ў тым, каб забяспечыць магчымасць перспектывы для інстытута. Вось галоўная прычына таго, чаму мы сталі турнага майстэрства, нам ёсць з кагo браць прыклад.

З НАМІ ЛЮДЗЯМ ЦЯПЛЕЙ

Слова — **галоўнаму інжынеру Рышарду КАЦЬНЕЛЬБО.**

— Сёння ва ўвесь рост паўстала праблема энергазберажэння, таму надаём вялікі больш сур'ёзную ўвагу канструяванню энергаэфектыўнасці. Мы на тры-чатыры гады апярэдзілі адлаведную дырэктыву кіраўніка дзяржавы № 3, і ў сучасній Каліфарнійскай вобласці запраектавалі цэлы квартал жылых дамоў, у якіх прадугледзелі ацяпляльныя агрэгаты ўнутры кватэр. Гэта значыць, з ізаляваным сістэмай ацяплення, для кожны жыхар рэгулюе тэмпературны рэжым сам.

Гэта быў наш першы вопыт. Потым «шыфавалі» ў райцэнтрах Гродзенскі шчыны, пабліжу якіх не праходзяць магістральныя цеплавыя сеткі — у Навагрудку, Смаргоні, Бярозаўцы. Калі не атрымлівалася падаць-ціць цэнтралізаванае цеплазабеспячэнне, ставім «кацялкі», якія забяспечваюць спажыўцоў цяплом і гарачай вадой пастаянна. Практыка паказвае, што жыльцы выкарыстоўваюць іх даволі эфектыўна. Летась абследавалі жылы дом у Бярозаўцы і зайшлі ў кватэру, у якой не проста цёпла, а вельмі цёпла. Там стаіць лакальны кацёл, і гаспадыня так навучылася ім карыстацца, што нават пры вонкавай температуры вады ў катле — 22 градусы — у кватэры — абсалютны «Ташкент». Камунальныя расходы ў яе не перавышаюць 45 тысяч у месяц.

Падлічана, што прыкладна да 30 працэнтаў страт цеплавых рэсурсаў прыпадае на магістральныя цеплавыя сеткі. Многія сеткі старыя, да таго ж — працяглыя, і іх эксплуатацыя бывае часам надзвычай затратнай. Не выпадкова заразпрадпрымаюцца меры. У Гродне, старажытным прыдбаўі ўласную кацельню.

Але і на цэнтралізаваных сістэмах ацяплення таксама можна эканоміць, калі перайсці на сістэму аўтаматычнага ацяплення дома, дзе ўсё змешваецца і немагчыма зразумець, што эканоміць, а што не. Гады чатыры таму мы пабудавалі ў Гродне дом, у якім запраектавалі стаяк толькі па лесвіцы з тэрмарэгулятарамі, якія выпускаюць дзённае харчаванне. Сяроднеспісочны кошт — «здаровае харчаванне» — распрацоўка і ўкараненне на вытворчасці шчодрага і вельмі разнастайнага дыетычнага харчавання ў кантакцыонным прадпрыемстве «Белпласт-МАМА»). Маляўцы кансерваванага дыетычнага харчавання, у якім ёсць і вяршкамі, і чарнілам і вяршкамі, і перасікам і вяршкамі «Вырастай-ка»). Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат (таварог-ДМ для дзіцячага харчавання), СЗАТ «Белатміт» (сасіскі «Мішутка» для дашкольнікаў і школьнікаў). Дарэчы, ААТ «Белпласт» стала у 2008 годзе таксама лаўрэатам конкурсу «Лепшыя таварыпрадпрымальнікі Беларусі» — «Лепшыя прадпрымальнікі Беларусі». У Расіі ж мясному аддзелу самай сухі малочны прадукт для дзіцячага харчавання, убагачаны бактэрыяльным канцэнтратам ацыдафільных палачак і біфідабактэрый «Белпласт-2 біфіда».

З 1 чэрвеня 2008 года ў Беларусі была ўведзена маркіроўка харчовай прадукцыі знакам «Натуральны прадукт» —

***Знак «Натуральны прадукт» можа змяшчацца толькі на прадукцыі, выраблёнай з натуральнай сыравіны жывёльнага, раслінна га або мінеральнага паходжання, з выкарыстаннем метадаў генной інжынерыі і штучных харчовых дабавак**, — патлумачыла **начальнік аддзела тэхнічнага рэгулявання і стандартызацыі харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Людміла СКОРЫНА.** — Такія прадукты адлавядаюць вельмі жорсткім патрабаванням. Напрыклад, пітная вада, расфасаваная ў бутэлькі, павінна адлавядаць пітнёўнай нормативах, што прымяняюцца да вады для дзіцячага харчавання. Разлічы мінеральных водаў павінен ажыццяўляцца без іх разбаўлення непасрэдна на месцы размяшчэння падземных крыніц. Забараняецца выкарыстоўваць мінеральныя воды пад рэцэптуры, не адпаведныя ім. Ужо ў здавольваюць мінеральныя воды. Адна з абавязковых умоў — наяўнасць на прадпрыемстве сертыфікаванай сістэмы менеджмэнту якасці і (ці) бяспекі харчовых прадуктаў.

Што ж, Беларусь правадзіць конкурс «Лепшыя таварыпрадпрымальнікі Беларусь». Летась лаўрэатамі ў намінацыі «Харчовая таварыпрадпрымальнікі Беларусь» у вайчынных прадпрыемствах, у тым лічы і прадпрыемствах, якія выпускаюць дзіцячае харчаванне. Сярод лаўрэатаў конкурсу 2008 года — Віцебскі дзіцячы ААТ «Белпласт» (сухія малочныя прадукты для дзіцячага харчавання «Белпласт», сухія малочныя прадукты для харчавання малыша захаванне ў канчатковым прадукцыі Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Людміла СКОРЫНА.

У апошні час нас усё больш «зацягвае» прагрэсіўнае манапітнае домабудаванне. Запраектавалі першы дом, на чарзе — іншы. У ім больш эканамічная і моцная ўнутраная структура, а вонкавы выгляд сучаснейшы. Абышліся без газаслікатных блокаў.

АД ПАМЫЛАК ЗАСЦЕРАГАЕ СІСТЭМА

Чаргову субяседнік — **галоўны спецыяліст па якасці Галіна САЎЧАНКА-ВА.**

— Сістэма менеджмэнту якасці, якая распрацавана і дзеянічае ў інстытуце, ахоплівае ўсе этапы кіравання якасцю праць калектыву. Яна рэгулюе перш за ўсё асноўныя віды дзейнасці інстытута — геадэзічныя і інжынерна-тэалагічныя пошукі, праведзенне абследаванняў будынкаў і пабудоў, непасрадзна распрацоўку праектнай дакументацыі, аўтарскі нагляд і г.д. Сістэма на ахоплівае ўсе этапы інстытута (летась больш чым у 22 разы і працягвае расці).

Калі гаварыць пра асноўныя віды нашай дзейнасці летась, то аб'ём выкананых работ і паслуг мы атрымалі з ростам больш чым 120 працэнтаў у параўнанні з 2007 годам. Прадукцыйнасць працы за той жа перыяд узрасла і склала 118 працэнтаў, а прыбытак — 145 працэнтаў. Расце і такі важны паказчык, як рэнтабельнасць.

Радуе, што ва умовах сусветнага крызісу ўрад бярэ курс на лібералізацыю эканомікі: у цэнаўтварэнні, падатковай палітыцы. Трэба далей шліфаваць і нарматыўную базу, бо часта даходзіць да парадоксаў. Калі ўзнікае нейкае складанае пытанне, на якім «завязаны» адразу некалькі распрацоўшчыкаў ведамстваў, то на выпуск у месцу розныя дзяржаўныя органы могуць даць абсалютна розныя адказы.

АД РЭДАКЦЫІ. *Вікаэвае удзячнасць за дапамогу у падрыхтоўцы публікацыі начальніку тэхнічнага аддзела Уладзіміру МАСЛЕЕВУ, начальніку праектнай вытворчасці Аляксандру ЯЧКОВІЧУ, галоўнаму архітэктару праектаў Аляксандру ЗАХАРЧУКУ, архітэктару Уладзіміру ЯЧКОВІЧУ, кіраўніку праекта-рэгуляваль майстэрні Уладзіміру ШАПАВАЛАВУ і іншым супрацоўнікам інстытута. Усё, што яны нам расказалі, пастараліся выкласці ў наступных публікацыях.*

Шчыра падзяка галоўнаму архітэктару Аляксандру ТАРАНЕНКУ за дапамогу ў падборы фотаілюстрацый. Дарэчы, Аляксандр Барысавіч — аўтар большасці здымкаў.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Вераніка АРЛОЎСКАЯ.

На здымках:

1. Дырэктар Уладзімір ДЗЯШКО.
2. На плошчы Савецкай дыскусіі ладзяць архітэктары і дойлды.
3. Цэнтральны мост праз Нёман заўсёды абрысы свайго пабудовы, які нарадзіўся сто гадоў таму. Ён ужо ажыццяўлены ў дзесяці праектах, якімі не трэба шукаць аб'ёмныя ідэяў.
4. Месца сустрэч заказанных — парк Жылібера.
5. Мікрараён «Дзевятоўка» — самы ўтульны.
6. «Газавая атака»: (злева направа) галоўны спецыяліст па якасці Галіна САЎЧАНКА, галоўны спецыяліст па канструкцыях Леанід БЯЛЯЎСКІ, галоўны архітэктар інстытута Аляксандр ТАРАНЕНКА і галоўны інжынер праектаў Алег ЯРАШЭВІЧ.
7. Ракантрукцыя пакаленняў на Свіслачы пакажэ пасажырам камяніцы «фанатаў» эканамічнага возера.
8. 3000 кватэр могуць адначасова запампаваць на 20 відаў спорту на плошчы і ў залах комплексу «Мінск».
9. Можна па-добраму пазайздросціць жыхарам дома на вуліцы Рыжых — такі прыгажэчу!

УНП 500055590.



15 сакавіка — Сусветны дзень абароны спажыўцоў

ЮНЫЯ АХВЯРЫ «СМАЧНАЙ» РЭКЛАМЫ

«Стоп маркетынгу нездаровага дзіцячага харчавання. Беларускія прадукты — для здаровага харчавання» — менавіта пад такім дэвізам пройдзе ў Беларусі Сусветны дзень абароны спажыўцоў.

Агрэсіўная маркетынгавая і рэкламная палітыка вытворцаў нездаровай ежы, якія абралі маладое пакаленне аб'ектам для атрымання прыбытку, не пакідае абыякавай сёння ні Сусветную арганізацыю саюзаў спажыўцоў, ні Сусветную арганізацыю аховы здароўя (СААЗ). Асаблівае хваляванне ў спецыялістаў выклікае ўзаемасувязь паміж збытам так званай смеццевай ежы і паўсюдным распаўсюджваннем атлусцення. Па звестках СААЗ, у ЗША колькасць дзяцей, якія церпяць ад атлусцення, павялічылася за апошнія 20 гадоў у тры разы. Паказчыкі залішняй вагі і атлусцення працягваюць расці ва ўсіх краінах свету паралельна з распаўсюджваннем пунктаў продажу прадуктаў хуткага харчавання і шырокамаштабнай рэкламай нездаровай ежы, багатай на соль, цукар і тлушчы з нізкім утрыманнем карысных і пажыўных рэчываў.

У пытанні абароны права дзяцей на здароўе з розных бакоў барыкады знаходзяцца медыкі, педагогі і прадстаўнікі індустрыі харчавання. Дзеці разглядаюцца апошнімі ў якасці сродку магутнага ўздзеяння на бацькоўскія выдаткі. На мове маркетолагаў гэта называецца «ўплывам дзяцей на спажывецкія паводзіны бацькоў». Прыхільнікі неабмежаванага маркетынгу перакладаюць маральную адказнасць за кантроль над дзіцячым харчаваннем цалкам на плечы бацькоў і не абмяжоўваюць сябе ў выбары метадаў прасоўвання тавару.

Прыдумаўшы дваццаць гадоў таму Happy Meal з цацкай, «Макдональдс» атрымаў самую лаяльную аўдыторыю ў свеце. Цацка дапамагае прадаць дзецям той тавар, які сам па сабе для іх нецікавы. Гэты прыём бяспройгрышны, паколькі многія дзеці просяць бацькоў набыць ім прадукт выключна дзеля цацкі. Да таго ж загорнутая ў фірмовую ўпакоўку «Макдональдса» ежа падаецца дзіцяці намнога больш прыцягальнай чым прадукты ў звычайнай упакоўцы. У ходзе даследавання, праведзенага спецыялістамі Стэндфардскага ўніверсітэта, было ўстаноўлена, што дзеці лічаць ежу больш смачнай, калі мяркуюць, што яна была выпушчана буйной кампаніяй з вядомым брэндам.

Бамбасцеры, тэлепузікі, пакемоны цікавяць дзяцей значна больш, чым карысныя ўласцівасці прадукту. Але пры гэтым дзеці — самая складаная аўдыторыя, якая патрабуе глыбокага разумення і творчага падыходу. Дарослы можа не звяртаць увагі на непрывабную ўпакоўку ці няўдалую рэкламу, калі яму спадабаецца сам прадукт. А дзіцяці патрабуецца «жывы», цікавы брэнд. Калі ўзровень даходаў застаецца адносна нізкі, дзеці і дарослыя спажываюць адны і тыя ж прадукты. А чым даходы вышэйшыя, тым больш прадуктаў, разлічаных спецыяльна на дзяцей, набываюць бацькі.

Аранжавае малако, фіялетавы кетчуп, зялёны ёгурт — цудоўны спосаб накарміць дзіця прадуктамі, якія ён адмаўляецца есці. Першай апрабавала «гульні з ежай» кампанія «Heinz», прапанаваўшы дзецям маляваць каляровым кетчупам на хлебе. У Еўропе і ЗША стваральнікі дзіцячага кіно і мультфільмаў яшчэ з моманту прыдумвання герояў супрацоўнічаюць з вытворцамі тавараў. І на момант выхаду мультфільма ці кінастужкі на экраны ў продажы з'яўляюцца марожанае, шакаладныя батончыкі, сыркі і іншыя тавары з новым персанажам на ўпакоўцы. Для фільма ўся гэта прадукцыя служыць своеасаблівай падтрымкай, а сам фільм — інструментам для яе прасоўвання.

Прапановы абмежаваць рэкламу нездаровай ежы пастаянна гучаць у розных краінах свету. Рэклама — гэта сродак маніпулявання асобай. З улікам высокай унушальнасці і эмацыянальнай уразлівасці дзяцей, найбольш эфектыўным рашэннем была б забарона ўсёй рэкламы, якая атакуе дзяцей, — так лічаць многія псіхолагі. Напрыклад, у Вялікабрытаніі дзеці да 10 гадоў пазнаюць ужо да 400 (!) брэндаў.

У Аўстраліі ў 2002 годзе была сфарміраваная Кааліцыя, якая аб'яднала медыкаў і спажыўцоў. Кааліцыя заклікае забараніць усю рэкламу прадуктаў харчавання, накіраваную на дзяцей, у гадзіны, на якія прыпадае пік дзіцячых перадач, а таксама праводзіць прапаганду здаровага харчавання пры дапамозе некамерцыйнага сацыяльнага маркетынгу.

Францыя ў гэтым пытанні абрала асаблівы падыход, які заключаецца ў тым, што ўсе віды тэлевізійнай рэкламы перапрацаваных прадуктаў, прадуктаў харчавання і напояў, якія ўтрымліваюць тлушчы, падсаладжальнікі ці соль у вялікай колькасці, павінны суправаджацца папярэджваннямі аб іх шкодзе для здароўя.

— Раней Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя быў створаны Кодэкс маркетынгу заменнікаў груднога мацярынскага малака, а цяпер вядуцца работы над рэкамендацыямі па маркетынгу прадуктаў харчавання і безалкагольных напояў для дзяцей. Плануецца, што яны будуць агучаны на Сусветнай асамблеі СААЗ у маі 2010 года, — паведаміла **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША**. — Мы падтрымліваем пазіцыю СААЗ па прапагандзе груднога выкормлівання, якое стварае падмурак для здароўя і здаровага харчавання на ўсё жыццё, і прапануем унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» забарону на рэкламу прадуктаў харчавання для дзяцей ва ўзросце да 6 месяцаў. Таксама мы прапануем унесці ў стандарт «СТБ 1100-98. Прадукты харчовыя. Інфармацыя для спажыўцоў. Агульныя патрабаванні» папраўкі аб пазначэнні колькаснага ўтрымання цукру, солі, а таксама насычаных тлушчаў у харчовых прадуктах. Сёння беларускія спажыўцы (за выключэннем малочнай прадукцыі і кандытарскіх вырабаў) не знаходзяць на этыкетках прадуктаў патрэбнай інфармацыі. Прыводзіцца толькі інфармацыя аб агульнай колькасці вуглеводаў.

Сусветная арганізацыя спажыўцоў, членам якой з'яўляецца і Беларускае таварыства абароны спажыўцоў, вядзе зараз актыўную работу па прасоўванні так званага святлафору на этыкетках, каб спажывец па колеры мог зарыентавацца, наколькі высокім з'яўляецца ўтрыманне ў тым ці іншым прадукце патэнцыйна небяспечных кампанентаў: тлушчаў, цукру і солі. Так, чырвоны колер будзе сігналізаваць аб высокім іх утрыманні, жоўты — аб сярэднім, а зялёны будзе паведамляць, што соль, цукар і тлушчы ў норме.

Па словах Ганны Сушы, іх калегамі з Канфедэрацыі таварыстваў спажыўцоў краін СНД было праведзена даследаванне тэлевізійнай рэкламы дзіцячых прадуктаў харчавання, размешчаных на расійскіх тэлеканалах. Пасля апытання высветлілася, што рэклама ўздзейнічае і на выбар бацькоў. Хітрыя маркетынгавыя хады вытворцаў спрыяюць устойлівай прывязанасці да таго ці іншага брэнда. Між іншым, вельмі часта гэтыя прадукты характарызуюцца надзвычай высокім утрыманнем цукру, тлушчаў і солі. Пры гэтым атрымаць праўдзівую інфармацыю аб сапраўдным утрыманні патэнцыйна небяспечных кампанентаў у ежы немагчыма...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Тэрміны дзеяння пасведчанняў аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі будуць павялічаны да пяці гадоў

Тэрміны дзеяння пасведчанняў аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгламентацыі і рэгістрацыі на прадукцыю айчыннай і замежнай вытворчасці будуць павялічаны да пяці гадоў. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў Беларусі ад 9 лютага 2009 года № 171 «Аб зацвярджэнні пераліку адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва адносна юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, і аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2007 г. № 1430», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя. Гэты дакумент уступае ў сілу 12 мая 2009 года.

БЕЛТА.

«У БЕЛАРУСКАГА БІЗНЭСУ НЯМА ЗВЯРЫНАГА ВЫСКАЛУ КАПІТАЛІЗМУ»

...Нейкі дробны чыноўнік з нейкага дзяржведамства вельмі неаб'ектыўна ставіўся да прадпрымальнікаў. І розныя іх прапановы па паляпшэнні эканамічнай сітуацыі ў краіне прапускаў міма вушэй. Маўляў, што там карыснага могуць сказаць гэтыя бізнэсоўцы. Доўга яго ўгаворвалі хаця б пачытаць іх Нацыянальную платформу і ўсё ж угаварылі. Ды вырашылі «праверыць» чыноўніка — у вокладку ад прадпрымальніцкай Нацыянальнай платформы паклалі План першачарговых мерапрыемстваў па лібералізацыі, распрацаваны Урадам. І чыноўнік ці то чытаў яго, ці то не, але дакументцік... аблаяў... Такую ці то байку, ці то праўду пачуў я на асамблеі дзелавых колаў, калі прадпрымальнікі казалі, што месцамі пра іх праблемы і прапановы проста не хочуць чуць. У прынцыпе, гэта не лагічна, бо хто, як не бізнэсоўцы, ведаюць эканамічную сітуацыю знутры. Сёння мы пагаворым пра праблемы беларускага бізнэсу і пра магчымыя варыянты развіцця эканамічнай сітуацыі са старшынёй саюза юрыдычных асобаў «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва», дырэктарам гандлёвага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Трыдакта» Віктарам МАРГЕЛАВЫМ:

— Вось у Нацыянальнай платформе бізнэсу на 2009 год, прынятай нядаўна на рэспубліканскай асамблеі дзелавых колаў, выдзелена 12 самых важных і першачарговых крокаў. Але вельмі сумніўна, што Урад выканае ўсе пункты адразу. Можна вылучыць з іх самы-самы важны і набалелы?

— Па-першае, адразу хачу расставіць кропкі над «і»: ніхто і ніколі не казаў, што ўсе пункты трэба выканаць заўтра. І па-другое, мы не збіраемся выконваць функцыі Урада, бо заўсёды недзе заканчваецца праца бізнэс-супольнасці і пачынаецца праца прафесіяналаў. Мы можам дапамагаць ім пісаць добрыя нарматыўна-прававыя акты, экспертызу даваць, але не больш за гэта. Іх некалькі тысяч у гэтым працэсе, а нас толькі некалькі дзясяткаў, што можа з імі прафесійна размаўляць. А тысячы прадпрымальнікаў толькі кажуць, дзе баліць... Натуральна, пасля таго як у якасці ідэі прымаецца Нацыянальная платформа, трэба думаць, як і што ў першую чаргу рабіць. Нельга ж ступіць і правай, і левай нагой адначасова. Нешта першае трэба пачынаць рабіць, але разумеючы, што за тэрмін будзе рабіцца і другое. Абсалютную большасць нашых прапановаў можна вырашыць на працягу гэтага года. Так, чыноўнікам трэба будзе заняцца інтарэсамі дзелавой супольнасці замест нейкіх сваіх прыярытэтаў, але чаму не? Справа не ў грашах, не ў тым, што гэта нерэальна ці супярэчыць дзяржаўнай палітыцы, а ў тым, што гэтым проста трэба заняцца. Дык давайце рабіць, мы гатовыя дапамагаць. З 12-ці ўжо выбіраць няма куды, гэтыя 12 — самыя галоўныя. Пытанне ў іншым — у якой паслядоўнасці іх выконваць. Мы прэтэндуем на тое, што прапанавалі ідэі Ураду, а ён хай піша план, бо мы ж не Урад.

— Адзін з гэтых 12 пунктаў — увядзенне свабоднага цэнаўтварэння. Хутчэй за усё, дзяржава проста баіцца, што калі цэны адпусціць, то яны рэзка папаўзуць уверх. Што трэба зрабіць для практычнага пераходу ад цэнтралізаванага рэгулявання цэнаў да свабоднага?

— Пытанне свабоднага цэнаўтварэння ўпіраецца ў нашае антыманапольнае заканадаўства і адпаведныя органы, якія трэба стварыць. Але хіба прадпрымальнікі вінаватыя, што такіх органаў няма? Калі дзяржава разумее іх патрэбу, то давайце ствараць. Напрыклад, паўгода адводзім на разгортванне антыманапольных інстытутаў, а потым робім свабодныя цэны. Разумна? Разумна! Безумоўна, я цалкам згодны, што структура антыманапольнага рэгулявання складаецца з дзвюх частак: па-першае, трэба стварыць заканадаўства, якое б забяспечыла прававыя антыманапольныя рамкі, і, па-другое, трэба антыманапольныя органы запусціць. Вось якраз камітэт па цэнах можа быць пераўтвораны ў антыманапольны орган. Толькі яны ўжо не будуць хадзіць па крамах і пытаць, чаму сёння мандарыны падаражэлі, а будуць назіраць за пастаўшчыком-манапалістам гэтых мандарынаў на беларускі рынак і думаць, што зрабіць, каб пастаўшчыкоў мандарынаў было шмат. Гэта значыць праца будзе трохі іншай: змагацца не з наступствамі, а з прычынамі. Грамадскасць да нагляду за манапалістамі трэба падключыць, прэсу, трэба імкнуцца да стварэння рэальнай канкурэнцыі, дэманапалізацыі. Вось прыклад: цэны на нафту ў свеце ўпалі ў тры разы, а цана на бензін у нас толькі падымаецца. От тут павінен працаваць антыманапольны камітэт і глядзець, хто вяршкі здымае. Я разумею высакародную мэту, што і бюджэт болей атрымлівае, але мяркую, што не толькі бюджэт...

Далей нам патрэбны механізмы самарэгулявання рынку, адпаведныя інстытуты, асацыяцыі, створаныя самімі ўдзельнікамі рынку, хай на першым этапе і пры ўдзеле дзяржавы. Правобраз — таварыства ацэншчыкаў. Такія ж механізмы павінны быць створаны і ў гандлёвай сферы, і ў іншых. З аднаго боку, мы такім чынам паменшым дзяржаўныя выдаткі на рэгуляванне, а з другога боку мы зможам фарміраваць больш гнуткія правілы для ўдзельнікаў рынку, пра што сведчыць і сусветны вопыт. Дзяржава ніколі не паглыбіцца ў нюансы, не зразумее глыбіні, а пры хутка зменлівай сітуацыі патрэбныя больш гнуткія механізмы самаарганізацыі рынку. Сёння ў нас два шляхі: альбо мы застаёмся на прынцыпах сацыялізму, альбо пераходзім на рынкавую сістэму, як ва ўсім свеце. За тры дні гэтага не зробіш, механізмаў не наладзіш, ды і ніхто не кажа, што цэнарэгуляванне заўтра трэба адмяняць. Трэба ўвязаць мерапрыемствы адно з адным і, скажам, праз год перайсці на свабоднае цэнаўтварэнне. Без яго мы, умоўна кажучы, не можам сёння мець эфектыўную эканоміку, якая сама сябе выцягне за валасы. Калі раней, яшчэ год таму, мы маглі сабе дазволіць пры наяўнасці каласальных дзяржаўных рэсурсаў дапамагаць развівацца прадпрыемствам, даваць грошы на інавацыі, то на сёння такіх магчымасцяў няма. І вельмі сумніўна, што большасць нашых дзяржаўных прадпрыемстваў здольная пры скарачэннях рынкаў захаваць рэнтабельную працу. Так, раней дзяржаўная форма арганізацыі вытворчасці была больш выгрышнай, але зараз, ва ўмовах фінансавага эканамічнага крызісу, калі разбуроцца старыя рынкі збыту і гэтак далей, сусветны вопыт паказвае, што дзяржпрадпрыемствы ў такой сітуацыі не надта спрытныя. Новую нішу на свае страх і рызыку лепей знаходзяць камерсанты, якія рызыкуюць і ўласным капіталам, і аўтарытэтам, і жыллём, і будучыняй сваёй сям'і, а не проста прэміяй дырэктару завода. Мы баімся, як людзі гаспадарлівыя, што калі пачнуць закрывацца заводы, то праз 2-3 гады іх прастою з іх раскрадуць усё. Мы лічым, што трэба знаходзіць варыянты ў агульным інтарэсе, і калі ёсць магчымасць знайсці рэальнага гаспадара, які не пагоршыць сітуацыю, то гэта трэба рабіць у разнастайных формах: арэнды, продажу з растэрміноўкай, продажу за 1 базавую велічыню і гэтак далей. Так мы зможам падняць айчынны бізнэс, пакуль яшчэ ёсць час — прыкладна год. Потым і платформа будзе іншая, і прапановы іншыя, бо, як кажуць, позна піць Баржомі будзе...

— Значыць, для пераходу на свабоднае цэнаўтварэнне нам трэба зрабіць два крокі: спачатку стварыць антыманапольныя органы і заканадаўства, а потым — інстытуты самарэгулявання?..

— Іх можна ствараць паралельна. За месяц можна пераўтварыць камітэты па цэнах у антыманапольныя органы. З самарэгуляваннем паскладаней будзе — спатрэбяцца месяцы 2-3. На сёння няма ніводнага разумнага абгрунтавання, чаму вытворцы не могуць самі вызначаць цану на сваю прадукцыю, за выключэннем таго, што за манапалістамі трэба назіраць. У тым жа Мінэканомікі прапаноўвалі выдзеліць 400 пазіцый, якія дзяржава будзе рэгуляваць. Перш за ўсё гэта паліўна-энергетычныя рэсурсы — электрычнасць, нафта, бензін, ЖКГ і гэтак далей. Вось гэта — правільны падыход. Бо тут сапраўды складана разабрацца, а цэны кладуцца на ўсё астатняе, тут, безумоўна, патрэбна дакладнае дзяржрэгуляванне. А ва ўсім астатнім рынак хутка ўсталюе ўсе цэны. Зноў пытанне, што цэны падымуцца. Натуральна, спачатку падымуцца, але ж трэба памятаць, што большасць з нас выступае ў 2 асобах: як працаўнікі, напрыклад, малаказавода мы зацікаўлены ў павелічэнні цаны, а з другога боку, як пакупнікі заўтра ў краме, мы зацікаўлены ў памяншэнні цаны. Можа быць пераразмеркаванне рэсурсаў, калі пры высокіх цэнах на малако з'явіцца шмат ахвотных яго вырабляць і паціху цэны знізяцца. Праўда, такія працэсы будуць ісці павольна. Ды і па вялікім рахунку, рэгуляванне цэнаў у краіне ў прынцыпе не залежыць ад нашых вытворцаў ці гандлю — мы маленькая адкрытая краіна і можам выставіць цэны, груба кажучы, прыкладна так, як і ва ўсім свеце. Калі наш вытворца скажа, што хлеб павінен падаражэць у два разы, то, напэўна, адразу з'явяцца камерсанты, якія з Расіі пачнуць вазіць хлеб і закрыюць гэтую нішу. І гэта будзе правільна. Так што баяцца вялікіх перагібаў накшталт таго, што ўсё падаражэе на 30 працэнтаў і вышэй, не трэба. Глабальна баяцца не варта. У цэлым цэны застануцца такімі ж, але на штосьці павялічацца, а на штосьці паменшацца. Такім чынам рынак ліквідуе грымасы дзяржаўнага рэгулявання.

— Віктар Ягоравіч, паколькі ў вашую канфедэрацыю ўваходзяць саюзы прадпрымальнікаў, то дазвольце спытаць і пра ІПэшнікаў: наколькі дзейсным крокам з'яўляецца пераход да рэгістрацыі па заяўным прынцыпе?

— Статыстыка паказвае, што назіраецца ўсплёск рэгістрацый, іх больш, скажам, у два разы. Але гэта адкладзены попыт, бо ўсе пра такі крок ведалі з лістапада-снежня і проста чакалі. Я мяркую, што месяцы за 2 гэты патэнцыял скончыцца, і застанецца колькасць трохі большая, чым была да Указа. Гэта правільная рэч, добрая рэч, за рэдкімі агаворкамі вельмі правільная рэч, гэта сёння неабходна, але недастаткова. Дзелавы асяродак павінен змяніцца па іншых аспектах, і тады людзі ахвотна пойдуць. У кожнага ёсць мара пабудаваць добры дом, ездзіць на больш-менш прыстойнай машыне, не баяцца за заўтрашні дзень. Гэта нармальная мара, якую за кошт малога бізнэсу можна ажыццявіць. Але такой мары павінны дасягаць хаця б 30 % прадпрымальнікаў. А сёння мы бачым іншае. Чые катэджы стаяць? Думаеце, прадпрымальнікаў? Не, чыноўнікаў. Сёння выгадна быць чыноўнікам, знаходзіцца ў дзяржструктурах, а толькі пасля быць прадпрымальнікам.

— Раз-пораз уздымаецца пытанне пра тое, што трэба дазволіць ІПэшніку мець аднаго ці некалькіх наёмных працаўнікоў. Што вы лічыце на гэты конт?

— Тут комплекснае пытанне, пытанне дзвюх справядлівасцяў. Першая, якую рэалізуюць улады, заключаецца ў тым, што ўсе павінны быць роўнымі — і маленькі ІП, і вялізная дзяржаўная карпарацыя або холдынг. Такой роўнасці не атрымлівалася, бо ў ІП ільготы па падатках, дзяржрэгуляванні, і таму было вырашана зменшыць перавагі ІП да нуля. У нас іншы падыход, адпаведны пункт ёсць і ў Нацыянальнай платформе бізнэсу, — усе павінны быць роўнымі ў сваіх вагавых катэгорыях. Самым маленькім павінны быць самыя маленькія падаткі і дзяржрэгуляванне, да большых прадпрыемстваў — большыя патрабаванні, да манапалістаў — максімальныя. У нас жа атрымалася, што індывідуальныя прадпрымальнікі ў добрых умовах, а малы бізнэс мае такую ж нагрузку, як і ў вялікага прадпрыемства. А павінна быць выгадна на пэўным этапе перайсці з ІП у малое прадпрыемства, далей у сярэдняе і буйное. Я быў у ЗША — у іх там няма абмежаванняў на наёмных працаўнікоў у ІП. Але там так наладжана падатковая сістэма, што табе калісьці стане нявыгадна заставацца ІП. Плюс адказнасць. Індывідуальны прадпрымальнік адказвае за ўсё сваёй асабістай уласнасцю. І таму ў Амерыцы людзі імкнуцца засцерагчы асабістую адказнасць ад адказнасці арганізацыі. Умоўна кажучы, калі нехта паслізнуўся на кавуновай лупіне ў тваёй краме, то ты банкрут з-за судовых выдаткаў. Але адна справа, калі банкрут — тваё прадпрыемства, а іншая — калі банкрут ты сам і застаешся без дома, машыны і г.д. Патрэбны механізмы, якія б стымулявалі паслядоўны паступальны рост. А ў нас? Вось навошта было спрошчаны пераход з ІП у малое прадпрыемства рабіць часовым? Часовае дзеянне скончылася, і зараз глядзіце: я ІП, маю фонды — машыну, лядоўню, вітрыну. І хачу стварыць малое прадпрыемства. Дык дазвольце без падаткаў перанесці маю маёмасць у маё ж малое прадпрыемства і працаваць далей!..

— Ну і напрыканцы хацелася б спытаць пра сацыяльную адказнасць прадпрымальнікаў. Ужо шмат чуў пра яе ад розных бізнэсоўцаў, але нядаўна задумаўся — ці існуе яна насамрэч? Глядзіце, пасля дэвальвацыі курс еўра вырас, а цэны за арэнду гандлёвых плошчаў не ўпалі. Па ідэі, арэндадаўцы (яны ж таксама прадпрымальнікі) павінны былі ўзгадаць пра сацыяльную адказнасць і скінуць цэны ў еўра... Але гэтага не адбылося. Дык ці не пустыя словы пра сацыяльную адказнасць прадпрымальнікаў?

— Тут існуе цэлы клубок супярэчнасцяў. З аднаго боку, калі мы такія рыначнікі, то павінны рызнаць, што права на ўласнасць павінна быць поўным і арэндадаўцы маюць права самі прызначаць цэны. Але з другога боку, шэраг арэндадаўцаў падпадаюць пад катэгорыю манапалістаў, і таму яны могуць выпампоўваць усе сокі з прадпрымальнікаў-арандатараў. У прынцыпе, жыццё і тут прымусіла знізіць цэны, бо шмат гандлёвых месцаў пачынала пуставаць. Я гэта назваў бы нават не сацыяльнай адказнасцю, а «шкурным» інтарэсам. Пад сацыяльнай адказнасцю я разумею іншыя аспекты — працоўныя калектывы, зарплату. Я шмат чуў прыкладаў, калі наш бізнэс быў сацыяльна адказным. Літаральна днямі мы вырашалі пытанне па нашаму даччынаму прадпрыемству: прадаўцы атрымлівалі зарплату ў залежнасці ад выручкі, але па выніках лютага мы пабачылі, што там спад. Прычым не па нашай віне, а з-за таго, што зачыніўся вялікі завод і 1,5 тысячы працоўных «гуляюць» трэці месяц за свой кошт. Там у горадзе ўсяго 15 тысяч насельніцтва, плюс гастарбайтары папрыязджалі з Расіі без грошай і селі на шыі жонкам... Адпаведна і выручка ўпала. І мы вырашылі прыбытак раздаць на зарплаты людзям, каб яны ў іх засталіся на тым жа ўзроўні. Вось гэта я назваў бы сацыяльнай адказнасцю. Сёння трэба думаць пра людзей, пра калектывы. За рэдкім выключэннем, у нас няма звярынага выскалу капіталізму. Не думаю, што трэба баяцца прыватнай уласнасці, але пры ўмове, што лідарамі і ўласнікамі яе будуць нашыя беларусы, г.зн. людзі, якія выйшлі з нашай культуры. Для параўнання на прадпрыемствах з замежнымі інвестыцыямі, дзе іншая карпаратыўная культура, усё больш жорстка: крок улева, крок управа — звальненне. Таму мы прапануем падымаць менавіта айчынны бізнэс. Бо калі прапусцім гэтую магчымасць, дзяржаўную маёмасць разбурым, а айчынны бізнэс не падымем, то прыйдзе замежны, і будзе, як у той Венгрыі, дзе 90 % уласнасці належыць чужынцам. А гэта ўжо тужліва, я мяркую, гэта нікому не патрэбна...

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

Антыкрызісныя суботнікі

Заробяць грошы... на лодачную станцыю

У Віцебску гарвыканкам прыняў рашэнне аб правядзенні 14 і 15 сакавіка гарадскіх «суботнікаў» і «нядзельнікаў» па добраўпарадкаванні двароў, вуліц, паркаў, сквераў, а таксама тэрыторый, замацаваных за прадпрыемствамі і ўстановамі. Зароблены грошы будуць накіраваны на будаўніцтва, аснашчэнне абсталяваннем і інвентаром лыжароллернай трасы і лодачнай станцыі ў рэчышчы ракі Віцьба. Дзіўна, што ў горадзе трох рэк, «галоўная» з якіх — Заходняя Дзвіна, няма магчымасці ўсім ахвотным пракаціцца на лодках, катамаранах. Ужо колькі гадоў гаворыцца аб неабходнасці наладзіць адпаведны пракат.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе гарадской камунальнай гаспадаркі, гэта не значыць, што гараджане будуць працаваць на добраўпарадкаванні адразу два дні. Калектывы «падзеляцца» ў адпаведнасці з тым, у які дзень лепш адпрацаваць. Наконт таго, ці спадабаецца ў прынцыпе нядзённая ідэя гараджанам, напэўна, трэба абысціся без каментарыяў. Калі і да крызісу ў гарадскім бюджэце на тыя ж лодкі грошай чамусьці не знайшлося, пра што гаварыць цяпер.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕРШАЯ СОНЕЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Першы веснавы ўраджай прыгожых сакавітых таматаў паспеў і дастаўлены на прылаўкі нашых крамаў і рынкаў з агракамбіната «Ждановічы».

Аграном-хімік Кацярына КЛІМОВІЧ задаволеная «сонечнай прадукцыяй».

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов республиканской собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

Наименование предмета аукциона	Не завершенные строительством объекты: Здание блока цехов и право заключения договора аренды земельного участка	Здание инженерного корпуса и право заключения договора аренды земельного участка	Здание бытового корпуса со столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Здание центральной заводской лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка	Железнодорожный подъездной путь и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Дрогичин, ул. Ленина, 204				
Продавец недвижимого имущества	РУПП «Экзон-Глюкоза», г. Дрогичин, ул. Ленина, 204, тел. 01644 2 10 25				
Сведения о предмете аукциона	Здание блока цехов – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 3,5915 га, срок аренды – 50 лет	Здание инженерного корпуса – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 1,1671 га, срок аренды – 50 лет	Здание бытового корпуса со столовой – степень готовности – 55 %. Земельный участок площадью 1,0089 га, срок аренды – 50 лет	Здание центральной заводской лаборатории – степень готовности 50 %. Земельный участок площадью 0,9081 га, срок аренды – 50 лет.	Ж/д подъездной путь – длина 2,1 км, ширина – 1,51 м. Земельный участок площадью 2,5513 га, ограничения в охранных зонах линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений, срок аренды – 50 лет.
Условия аукциона	- использование объекта для осуществления предпринимательской деятельности; - создание и регистрация на территории Дрогичинского района юридического лица; - создание не менее 20 новых рабочих мест в 2009 году; - при организации производства, требующего соблюдения санитарной зоны, обеспечение выноса действующих складов РУПП «Экзон-Глюкоза» и РУП «Экзон» за пределы производства; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи	- использование объекта для предпринимательской деятельности, создание не менее 3 новых рабочих мест в 2009-2010 гг.; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи			
Начальная цена предмета аукциона, руб.	64 082 847*	20 848 097*	18 026 891*	16 229 306*	33 637 977*
Сумма задатка, руб.	6 408 000	2 084 000	1 802 000	1 622 000	3 363 000
Реквизиты счета для перечисления задатка	р/с 3642202530011 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538				
Организатор аукциона	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 0162 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63, www.brest-region.by				

** определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены продажи права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.*

Аукцион состоится **14 апреля 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие следующие документы:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

негосударственным юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

негосударственным иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

Представителям:

индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальный предприниматель Республики Беларусь, в том числе представитель негосударственного юридического лица, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию и государственной регистрации земельного участка; возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 13 апреля 2009 года включительно.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Ракаў чакае добры настрой, а Стральцоў — цудоўныя магчымасці

ВАЕН. Хутчэй за ўсё, давядзецца цэлымі днямі разбірацца з праблемамі, якія назапасіліся. Галоўнае — не запускаць бягучых спраў, інакш да канца тыдня цяжар стане непад'ёмным. Пачатак тыдня можа зблытаць усе планы і задумы, але ўжо ў сярэдзіне надыдзе праясненне. У чацвер больш увагі надайце родным, асабліва дзецям.

ЦЯЛЕЦ. Неўсвядомлена будзеце дражніць Фартуну — і зусім дарэмна. Трымайце сябе ў руках: праяўленні азарту зараз зусім не да часу. Гэтак жа як і крыўдлівасць, і амбіцыйнасць. Давядзецца некаторы час паводзіць сябе цішэй вады, ніжэй травы. Збіраць плады сваёй працы будзеце крыху пазней. Празорлівасць і інтуіцыя будуць вельмі дарэчы, дапамагаючы вам пазбегнуць канфліктных сітуацый. Можа змяніцца меркаванне аб некаторых сябрах.

БЛІЗНЯТЫ. Вы не проста павінны — вы будзеце вымушаны даводзіць да лагічнага завяршэння абсалютна ўсе справы, якія пачатыя менавіта на гэтым тыдні. У аўторак прыток сілаў дазволіць у літаральным сэнсе звярнуць горы. У гэты дзень ажыццявяцца нават самыя нязбыўныя мары. Галоўнае — не сумнявайцеся, бо ўсё залежыць ад вас.

РАК. Будзеце ў добрым настроі, дзякуючы чаму ўсё намечанае будзе атрымлівацца з першага разу. У крайнім выпадку — з другога. Калі прыкладзяце пэўныя намаганні, то перашкод у дасягненні жаданых вынікаў не ўзнікне. У другой палове тыдня з'явіцца магчымасць рэалізаваць свае жаданні і зрабіць адказныя крокі.

ЛЕЎ. Вельмі пажадана стрымлівацца і не каментаваць яхідна ўсё, што адбываецца. Вашу з'едлівасць запомняць надоўга, і ў патрэбны момант вы можаце апынуцца без падтрымкі толькі таму, што мелі неасцярожнасць сказаць штосьці крыўднае. У панядзелак і аўторак удалымі будуць дзелавыя сустрэчы. Ваша задача — зрабіць на партнёраў добрае ўражанне.

ДЗЕВА. Тыдзень прымусіць дзейнічаць нават самых лянівых. Сітуацыя абяцае скласціся такім чынам, што ад сур'ёзных крокаў будзе ўжо ніяк не адкруціцца. У панядзелак ці аўторак з'явіцца магчымасць закласці падмурак для буйных пазітыўных пераменаў. У сярэдзіне тыдня верагодныя клопатныя мерапрыемствы, якія звязаны з навядзяненнем парадку ў справах.

ШАЛІ. Рашэнні, ад якіх залежыць будучыня, прымайце самастойна. Не прыслухоўвайцеся да парадаў навакольных, бо ваша сітуацыя нестандартная. Знізьце крыху тэмп работы і скараціце яе аб'ём — вам неабходны кароткачасовы перапынак. Прыміце ўдзел у распрацоўцы новага праекта: знойдзеце шмат цікавага і карыснага для сябе. Аднак старайцеся пазбягаць непатрэбных кантактаў.

СКАРПІЁН. Рыхтуйцеся да барацьбы: ад намечанага не варта адступаць пры першай жа сустрэчы з перашкодамі. Такіх будзе дастаткова. У выпадку неабходнасці лепш не звяртацца па дапамогу да сяброў, а даручыць вырашэнне праблемы кампетэнтным спецыялістам. У сераду кожнае ваша слова для навакольных будзе мець велізарнае значэнне.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень можа адкрыць цудоўныя магчымасці. Тое, што раней падавалася недаступным, зараз можа вырашыцца з лёгкасцю. Многія праблемы знікнуць, а справы будуць ісці паспяхова, калі не праявіце залішняй рынцыповасці, крытыкуючы калег. Верагодны новыя кантакты, якія паспрыяюць пашырэнню дзелавых магчымасцяў. Работы будзе многа, але ўменне планаваць час дазволіць усё выканаць у тэрмін.

КАЗЯРОГ. Проста неабходна праявіць актыўнасць — гэта дазволіць рэалізаваць планы і ідэі, якія даўно вынашваліся. Не забывайцеся разбірацца з надзённымі праблемамі. Звярніцеся па параду да калег — і яны перастануць успрымаць вас з раздражненнем. Гэты манеўр дазволіць умацаваць ваш аўтарытэт.

ВАДАЛЕЙ. На пачатку тыдня будзеце выношваць важныя планы, якія рэалізуюцца ў найбліжэйшай будучыні. Вырашэнне спрэчнага пытання, якое ўзнікне ў панядзелак, лепш адкласці да пачатку наступнага тыдня. Не спадзявайцеся на парады сяброў — яны могуць збіць вас з панталыку. У аўторак аптымізм і ўпэўненасць у сабе зробяць для вас тое, чаго вы не дамагліся б ніякімі хітрыкамі.

РЫБЫ. Верагодны поспех на службе, якога вы зусім не чакалі. У дзелавых кантактах з партнёрамі праявіце асцярожнасць: верагодны падман, асабліва ў самым пачатку тыдня. У пятніцу і суботу зносіны з дзелавымі партнёрамі могуць прынесці жаданы поспех. Больш строга паставіцеся да свавольства дзяцей, бо яно можа скончыцца вельмі сумна.

МКАДу-2 — быць?

Сталічныя горадабудаўнікі разглядаюць магчымасць будаўніцтва другой кальцавой аўтадарогі.

Пра гэта расказаў старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Віктар НІКІЦІН.

«Відавочна, што ўжо праз тры—чатыры гады мы пачнём асвойваць землі з таго боку МКАД, — адзначыў ён. — На карце ўжо цяпер праглядаюцца будучыя жылыя раёны — Дзегцяроўка, Тарасава, Шчомысліца. Так што наяўная кальцавая дарога ў канчатковым выніку стане звычайнай гарадской магістраллю».

Менавіта таму ўжо сёння абмяркоўваецца будаўніцтва другой МКАД. Паводле слоў Віктара Нікіціна, гэта ідэя хутчэй за ўсё знойдзе адлюстраванне ў генеральным плане развіцця Мінска, які цяпер карэктуецца. Але другую МКАД цалкам замкнуць не атрымаецца: на поўначы прылягаюць буйныя лясныя масівы, якія чапаць нельга. Па задуме архітэктараў, гэта будзе паўкола на дзве трэці акружнасці сталіцы.

Вікторыя РАМАНАВА, *«Мінск—Навіны».*

Выпіска з рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў

Від інфармацыйнай прадукцыі	Найменне, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі	Найменне суда, які вынес рашэнне, і дата ўступлення ў сілу рашэння суда
Кніжныя выданні	«Няма дрэнных народаў», Мінск, ЗАТ «Праваслаўная ініцыятыва», 2007 г., 127 с.; протаіерэй Алег Чакрыгін «Чытаючы Евангелле. Развагі на евангельскія чытанні. Хто мы: хрысціяне або іудзеі?», Мінск, ЗАТ «Праваслаўная ініцыятыва», 2005 г., 95 с. (7-е выданне); Ерчак В.М. «Слова і Справа Івана Грознага», Мінск, ФУА Інфарм., 2005 г., с. 704; «Расія прабудзіся. У абарону Айчыны» складальнік ігумен Сімеон, Масква, «Імперыум-Прэс», 2005 г., 384 с; Платонаў О.А. «Тайны сусветны ўрад», серыя «Змова супраць Расіі», Масква, «Алгарытм», 2006 г.; Платонаў О.А. «Загадка Сіёнскіх пратаколаў», серыя «Змова супраць Расіі», Масква, «Алгарытм», 2006 г., Платонаў О.А. «Рускае супраціўленне», серыя «Вайна з антыхрыстам», Масква, «Алгарытм», 2006 г.; Платонаў О.А. «Вайна з унутраным ворагам», серыя «Змова супраць Расіі», Масква, «Алгарытм», 2006 г.; Барыс Міронаў «Ярмо іудзейскае», Масква, «Алгарытм», 2007 г.; Мікалай Жавахаў «Яўрэйская рэвалюцыя», серыя «Праект Алега Платонава» «Рускае супраціўленне», Масква, «Алгарытм», 2006 г.; «Забіванне Андрэя Кіеўскага. Справа Бейліса-«агляд сіл», Мінск, «Руская ідэя», 2006 г.; Філімонаў В.П. «Час суда», Мінск, ЗАТ «Хрысціянская ініцыятыва», у 2-х тамах, 2007 г.; «Даследаванне Халакосту. Глабальнае бачанне. Матэрыялы міжнароднай Тэгеранскай канферэнцыі», Масква, «Алгарытм», 2007 г., 272 с.	Рашэнне суда Савецкага раёна г. Мінска ад 19.12.2008 года.

На сушуканне прэміі ФПБ

НАПІСЯ ГАЮЧАЙ ВАДЗІЦЫ

Чытаю гэтыя радкі як чыстую, з самай глыбіні сэрца, споведзь аўтара перад роднай зямлёй. Паслухайце: «Няхай у сённяшні тлумны і няпросты час не пакіне нас святая памяць пра тыя мясціны, адкуль мы пайшлі ў жыццё. Няхай вобраз роднага краю будзе для нас светлым сімвалам малой радзімы і пастаянным напамінам пра самае галоўнае. А яно вось у чым: мы дужыя і нескароныя тады, калі моцна стаім на зямлі нашай, на гэтых сціплых палях, раздольных лугах, сярод задумлівых лясоў. У прыветлівых вёсачках, такіх добрых і шчырых, як і характар саміх беларусаў. Словам, калі заўсёды помнім пра свой бацькоўскі парог і родны кут».

Так піша ў сваім пранікнёна-хвалюючым нарысе «Пасвіў статак пастушок» вядомы беларускі журналіст Міхаіл Шыманскі. Пастушок — сам аўтар, яго імя даўно і добра знаёма нашым чытачам. 48 гадоў безупыннай, плённай працы — у найстарэйшай нашай газеце «Звязда», у самай папулярнай у часы СССР газеце «Известия», цяпер вось — у «Рэспубліцы». Колькі ж і пра самае рознае напісана амаль за паўвека пры выключнай творчай неўтаймаванасці аўтара.

Частку яго публікацый пад назвай «Мая вера — мая Беларусь» Міністэрства інфармацыі рэспублікі вылучыла на атрыманне прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Мяне вельмі зацікавілі і па-свойму ўсхвалявалі матэрыялы раздзела гэтай творчай работы «О, край родны, край прыгожы!..». Прызнаюся, што тут прысутнічае і асабісты момант: сам люблю разважаць і пісаць пра адметнае і святое ў нашым жыцці, што стварае дарагі і прывабны вобраз нашай роднай Беларусі — пра яе цудоўную прыроду. Таму роздум М. Шыманскага на гэты конт мне блізкі і зразумелы, прымаецца маім сэрцам і розумам.

Аўтар тлумачыць, што зусім не выпадкова назваў гэты раздзел узвышанымі паэтычнымі радкамі народнага песняра Беларусі. Праз яго вечную «Новую зямлю» М. Шыманскі вучыўся адкрываць і з яшчэ большай замілаванасцю любіць нашу родную прыроду. Разумець і цаніць сялянскую працу і побыт. У творы знаходзіў усё тое, што бачыў і адчуваў навокал, што хвалявала і турбавала вясковага хлопчыка, радавала і засмучала, чым ён жыў, пра што марыў. Усё гэта пранікала ў яго сэрца цудоўнымі коласаўскімі радкамі. І засталося назаўжды.

Лічу неабходным падкрэсліць наступную надзвычай важную акалічнасць. 2009-ы абвешчаны ў Беларусі Годам роднай Зямлі. Ён, безумоўна, пасадзейнічае, каб мы лепш захавалі і ўзбагацілі нацыянальную духоўную і культурную спадчыну, прыродныя багацці нашай краіны, каб больш мудра і эфектыўна выкарыстоўвалі пры выхаванні ў нашай моладзі пачуцця любові да роднай Бацькаўшчыны.

Спынюся на некаторых, найбольш адметных і важных момантах прыроднай тэматыкі М. Шыманскага.

Упэўнены, што шырокая грамадскасць Беларусі не ведае пра гэту падзею. Маленькі куточак беларускай зямлі ўключаны ў міжнародны праект. Гутарка ідзе пра наш прыродны комплекс «Блакітныя азёры» ў Мядзельскім раёне. Еўрапейская навуковая супольнасць і НАН Беларусі выдзелілі яго для глыбокіх даследаванняў па кірунку «Стратэгія захавання раслін у Еўропе». Аказваецца, нашы «Блакітныя азёры» даўно вядомыя як месца канцэнтрацыі рэдкіх раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі. Многія найкаштоўнейшыя расліны, што ў Еўропе сустракаюцца ў адзінкавых экзэмплярах, у нас — дзякуй Богу і добрым людзям — налічваюцца яшчэ дзясяткамі і сотнямі. А якія тут лясы, азёры, чыстыя крынічкі! У сваіх дзвюх публікацыях М. Шыманскі аналізуе і найбольш сур'ёзныя праблемы, што стаяць цяпер перад «Блакітнымі азёрамі». І як чалавек, бясконца ўлюбёны ў родную прыроду, прысвячае гэтаму цудоўнаму кутку свае наступныя вершаваныя радкі:

Накінула восень узоры // На нашы лясы і палі. // А тут вось — такія азёры, // Як сінія вочы зямлі. // Удзень тут птушыныя спевы, // Багата цвітуць верасы, // А ноччу — маўклівыя дрэвы, // А раніцай — свежасць расы. // Бруіцца жывая крыніца, // Прысядзь ля яе ў цішыні, // Напіся гаючай вадзіцы // І крыху душой адпачні.

Далей. Здаецца, пра Нарач мы ведаем усё. А М. Шыманскі прайшоў некалькі разоў па сцяжынцы, якая ціха сцелецца сярод сосен і дубоў па беразе возера да рэчкі Нарачанкі. Прызнаецца: ён хадзіў тут з кнігай Максіма Танка «Нарачанскія сосны». Чытаў і перачытваў яго вершы і быццам чуў голас паэта, яго здзіўленне і зачараванне самой Нараччу, лесам, што прывольна раскінуўся тут. Гэтая сцяжынка — сапраўдная жывая паэма прыроды, сцвярджае аўтар, праз вобразы і музыку лесу адкрываючы яе чытачам. І зноў жа, узнімае праблему: сцяжынка, безумоўна, можа прыцягнуць увагу людзей, якія прыязджаюць на Нарач адпачываць. Толькі трэба ім дапамагчы адкрыць гэты цуд.

М. Шыманскі надзелены шчаслівым дарам убачыць цікавае, дарагое і хвалюючае, здавалася б, у самым звычайным, на што мы не звяртаем увагі. Вось матэрыял «Хатка на зялёных далонях».

Пра што ж расказвае аўтар? Пра адзінокую, мілую сэрцу сядзібу, з трох бакоў атуленую старым лесам. Велічныя сосны, дзе-нідзе магутныя дубы, маўклівыя, па-свойму загадкавыя яліны. Вакол сядзібы ляжыць нешырокая палоска поплава, які летам — быццам абрус, сатканы прыродай з розных кветак і траў. Словам, хатка гэтая — бы на зялёных далонях добрай і ласкавай зямлі. І жыве тут працавітая бабуля Алена Пятроўна, якая не хоча перабірацца да дзяцей, бо, як кажа сама: «Там мне няма да чаго свае рукі прыласці, а я ж не магу без работы, без гэтага лугу, лесу». У гэтым жыццёвая мудрасць і сіла жанчыны — у цеснай еднасці з прыродай.

А вось псіхалагічная навэла «Дзяўчынка, чарніцы і пчолы». Самы просты эпізод — аўтар назірае, як дзяўчынка збірае чарніцы сваім сястрычцы і маці, што прыедуць яе, хворую, наведаць у бальніцы. І яна просіць аўтара: «Дзядзечка, а вы асцярожна тут хадзіце. Бачыце, колькі тут пчолак, яны таксама хочуць смачнага, іх нельга палохаць, таму я збіраю ягады вельмі ціха». Вось дзіўная сустрэча, ад якой стала цёпла на душы, піша расчулена аўтар.

Альбо ўспрыманне аўтарам жытнёвага поля, якое ў жніўні нагадвае яму вялікі каравай, што рыхтуе шчодры месяц («Жнівень каравай рыхтуе»). Ці створаны М. Шыманскім вобраз балота, з якім непарыўна звязана доля яго малой радзімы — вёскі Пешкі ў Бярозаўскім раёне. Паслухайце: *«А вёска Пешкі сваім лёсам // Навек зраднілася з балотам... // Мы летам цягнем тут пракосы, // Аж вочы заліваем потам».* Праз цікавыя дэталі, успаміны дзяцінства аўтар аргументавана даказвае, што балота — гэта не дрыгва і багна, а цэлы сусвет, надзвычай разнастайны, цікавы, нават хвалюючы. Ён просіць чытачоў не прымаць яго аповед пра балота як нешта асабістае. Такое святое, асабістае павінна быць у душы кожнага чалавека. Калі ж няма, яго трэба пашкадаваць...

Таму вельмі дарэчны ўключыў аўтар у гэты раздзел надзвычай цікавы нарыс «Думаю пра наша Дзяржынава, як пра казку». Аказваецца, чалавек з жалезнай воляй, рашучы ў сваіх дзеяннях, граза буржуазіі, які 11 гадоў правёў у турмах і на катарзе, Фелікс Дзяржынскі на ўсё жыццё захаваў у сваім сэрцы трапяткую любоў да сваёй сядзібы ў Беларусі, да цудоўнай прыроды, сярод якой прайшло яго дзяцінства. Такімі пачуццямі пранікнуты многія яго лісты да сваіх родных. «У гэтыя хвіліны я хачу апынуцца ў нашых лясах і слухаць шум дрэў... усю музыку нашай прыроды. Можа быць, у жыцці мне і давала сілу гэта музыка лесу, музыка маіх дзіцячых гадоў, якая і цяпер увесь час іграе ў маёй душы гімн жыцця...»

Я нездарма ўзяў загаловкам да свайго роздуму назву публікацыі М. Шыманскага «Напіся гаючай вадзіцы». Наша прырода — як шчодрая крыніца, якая дае нам гаючыя сокі і сілы для працы, для радасці, для добрага настрою, для ўсяго нашага жыцця. Слова М. Шыманскага аб прыродзе і нашым стаўленні ад яе — і ўзнёслае, і хвалюючае, і трывожнае, як і павінна быць. На жаль, у гэты раздзел не ўвайшлі яго шматлікія ранейшыя праблемна-аналітычныя публікацыі, у якіх ён вельмі глыбока і ўсебакова даследаваў экалагічную сітуацыю ў нарачанскім рэгіёне. Тыя матэрыялы атрымалі шырокі грамадскі рэзананс. Цыкл, пра які наша гаворка, яскрава сведчыць: для найстарэйшага беларускага журналіста прырода — па-ранейшаму прыярытэтная тэма. Бо, як правільна ён падкрэслівае, берагчы прыроду — значыць, берагчы Айчыну. Улічваючы актуальнасць тэматыкі, хачу спадзявацца, што публікацыі М. Шыманскага ў гэтым кірунку, як і цалкам уся паказаная творчая работа, будзе справядліва ацэнена пры абмеркаванні твораў, выключаных у намінацыі «Журналістыка» на сушуканне прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Віктар ШНІП,
лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва, прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага, прэміі «Залаты Купідон».

МТБанк
МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК

Наименование банка:

ЗАО «МТБанк», г. Минск

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 г.

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т прим.	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	18 690,1	12 916,2
3	Средства в Национальном Банке РБ	1102	2	17 446,8	33 481,4
4	Ценные бумаги:	1103		36 836,3	47 124,6
	для торговли	11031	3	63,8	341,9
	удерживаемые до погашения	11032	3,1	3 001,7	3 000,8
	в наличии для продажи	11033	3,2	33 770,8	43 781,9
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	54 163,7	58 088,7
6	Кредиты клиентам	1106	5	235 478,6	167 297,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	0,0	0,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	7 424,2	5 801,7
9	Прочие активы	1109	8	9 848,9	3 408,8
10	ИТОГО активы	110		379 888,6	328 119,2
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального Банка РБ	1202	9	288,6	4,5
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	56 999,2	77 086,4
14	Средства клиентов	1206	11	197 460,0	152 020,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		4 715,5	14,1
16	Прочие обязательства	1209	12	6 676,6	4 872,8
17	ВСЕГО обязательства	120		266 139,9	233 998,4
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	65 116,5	65 116,5
20	Эмиссионные разницы	1212		0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213		12 532,6	5 083,5
22	Накопленная прибыль	1214	14	33 117,3	21 664,2
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	2 982,3	2 256,6
24	Всего капитал	121		113 748,7	94 120,8
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		379 888,6	328 119,2
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	211 340,3	117 019,8
28	Обязательства	1302	17	105 005,2	77 925,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2008 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т прим.	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		36 289,4	23 203,6
2	Процентные расходы	2012		15 813,8	11 566,8
3	Чистые процентные доходы	201	18	20 475,6	11 636,8
4	Комиссионные доходы	2021		23 307,4	13 916,5
5	Комиссионные расходы	2022		2 363,4	1 729,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	20 944,0	12 186,9
7	Чистый доход от операций с иностранной валютой	203	20	15 038,4	9 231,8
8	Чистый доход от операций с ценными бумагами	204	21	-261,5	-92,2
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	1 546,7	570,5
11	Прочие доходы	207	23	3 874,0	520,0
12	Операционные расходы	208	24	29 945,9	17 711,3
13	Прочие расходы	209	25	3 527,4	1 732,9
14	Налог на прибыль	210		6 148,3	3 237,6
15	ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК)	2		18 902,2	10 231,0
16	Базовая прибыль на простую акцию			0,25	0,37
17	Разводненная прибыль на простую акцию			—	—

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2008 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование показателей / Наименование статей капитала	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль (убыток)	Фонд переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Раздел I. За год, предшествующий отчетному**							
2	Остаток на 1 января 2007 г.	3011	20 334,0	0,0	5 083,5	11 433,2	1 855,2	38 705,9
3	Изменения статей капитала в том числе:	3012	44 782,5	0,0	0,0	10 231,0	401,4	55 414,9
3.1.	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	*	*	*	10 231,0	*	10 231,0
3.2.	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	*	0,0	0,0	*	0,0
3.3.	операции с учредителями (участниками):	30123	0,0	0,0	*	0,0	*	0,0
3.3.1.	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	0,0	0,0	*	*	*	0,0
3.3.2.	выплата дивидендов акционерам	301232	*	*	*	0,0	*	0,0
3.3.3.	операции с собственными выкупленными акциями	301233	0,0	*	*	*	*	0,0
3.4.	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	401,4	401,4
3.5.	перераспределение между статьями капитала	30125	44 782,5	0,0	0,0	0,0	0,0	44782,5
3.6.	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
4	Остаток на 1 января 2008 г.	3013	65 116,5	0,0	5 083,5	21 664,2	2 256,6	94 120,8
5	**Раздел II. За отчетный год**							
6	Остаток на 1 января 2008 г.	3011	65 116,5	0,0	5 083,5	21 664,2	2 256,6	94 120,8
7	Изменения статей капитала в том числе:	3012	0,0	0,0	7 449,1	11 453,1	725,7	19 627,9
7.1.	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	*	*	*	18 902,2	*	18 902,2
7.2.	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	*	7 449,1	-7 449,1	*	0,0
7.3.	операции с учредителями (участниками):	30123	0,0	0,0	*	0,0	*	0,0
7.3.1.	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	0,0	0,0	*	*	*	0,0
7.3.2.	выплата дивидендов акционерам	301232	*	*	*	0,0	*	0,0
7.3.3.	операции с собственными выкупленными акциями	301233	0,0	*	*	*	*	0,0
7.4.	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	725,7	725,7
7.5.	перераспределение между статьями капитала	30125	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
7.6.	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
8	Остаток на 1 января 2009 г.	3013	65 116,5	0,0	12 532,6	33 117,3	2 982,3	113 748,7

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2008 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т прим.	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**Потоки денежных средств от операционной деятельности**				
2	Полученные процентные доходы	7010		36 289,0	23 203,7
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-15 054,3	-11 585,0
4	Полученные комиссионные доходы	7012		23 307,2	13 916,5
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-2 343,9	-1 726,1
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		15 038,3	9 231,9
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		-261,5	-92,2
8	Доход в форме дивидендов	7016		0,0	0,0
9	Прочие полученные доходы	7017		3 845,7	370,5
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-31 884,7	-18 143,8
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-5 580,0	-2 931,1
12	**Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах**	**701**		**23 355,8**	**12 244,4**
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		773,5	6 618,0
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах	7021		10 515,8	-20 535,7
15	Чистое снижение (прирост) кредитов и других денежных средств в банках	7022		-17 991,1	-8 335,2
16	Чистое снижение (прирост) кредитов, выданных клиентам	7023		-68 171,3	-63 026,6
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		-3 876,7	-4 051,5
18	**Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов**	**702**		**-78 749,8**	**-89 331,0**
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		0,0	0,0
20	Чистый прирост (снижение) кредитов и других денежных средств банков	7032		-21 864,9	58 086,1
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		39 358,5	40 120,3
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		4 266,6	-11,3
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		5 367,9	-1 609,9
24	**Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств**	**703**		**27 128,1**	**96 585,2**
25	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности**	**70**		**-28 265,9**	**19 498,6**
26	**Потоки денежных средств от инвестиционной деятельности**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7110		-2 513,5	-1 762,4
28	Продажа основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7111		5,7	9,5
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112		0,0	0,0
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113		0,0	0,0
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114		0,0	-4 963
32	Погашение(реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115		0,0	1 963
33	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности**	**71**		**2 507,8**	**-4 752,9**
34	**Потоки денежных средств от финансовой деятельности**				
35	Эмиссия акций	7211		0,0	44 782,5
36	Выкуп собственных акций	7212		0,0	0,0
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		0,0	0,0
38	Выплата дивидендов	7214		0,0	-3,1
39	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности**	**72**		**0,0**	**44 779,4**
40	**Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты**	**73**		**-221,8**	**575,3**
41	**Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов**	**74**		**-30 995,5**	**60 100,4**
42	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	X	71 351,7
43	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	1	40 356,2	X

Руководитель **А.К. Жишкевич.**
Главный бухгалтер **В.В. Ермолович.**
Дата подписания **11 февраля 2009 года.**

Проверенная годовая отчетность соответствует требованиям законодательства Республики Беларусь. Достоверность форм № 1, № 2, № 3, № 4 годового отчета подтверждена во всех существенных аспектах.

Директор АООО «Аудитэл» **А.И. Папковский.**

Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»

220012, г. Минск, пер. Калининградский, 16, тел./факс 280 35 39; e-mail: auditel@mail.ru

Аудитэл

р/с 3012007218011 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 100 г. Минск, код 749 УНН 100591487

№ 15
от 06 марта 2009 г.

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по годовому отчету за 2008 год

Председателю Правления Закрытого акционерного общества «Минский транзитный банк» А.К. Жишкевичу

Аудируемое лицо:
Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк»;
сокращенное наименование: ЗАО «МТБанк»;
место нахождения: 220033, г. Минск, Партизанский проспект, 6-а;
сведения о государственной регистрации: зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 14 марта 1994 г. за № 38. Перерегистрирован 13.10.2008 г. Регистрационный № 38. УНП 100394906.

Аудиторская организация:
Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»;
место нахождения: 220012, г. Минск, Калининградский пер., 16;
свидетельство о государственной регистрации в качестве аудиторской организации № 100591487 от 28 сентября 2000 г., выданное Минским городским исполнительным комитетом; УНП — 100591487
специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности 02200/0061001 от 03 февраля 2004 г., выданное Министерством финансов Республики Беларусь на срок по 02 февраля 2009 г., лицензия продлена до 02 февраля 2014 г. за номером 02200/0495343 от 02 февраля 2009 г.
лицензия на осуществление аудиторской деятельности в банковской системе № 2 от 17 ноября 2004 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь на срок 5 лет со дня выдачи.

Мы провели аудит прилагаемого годового отчета ЗАО «МТБанк», состоящего из бухгалтерского баланса на 01.01.2009, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств за 2008 г., примечаний, включая краткое описание существенных элементов учетной политики и прочие пояснения.

Руководство ЗАО «МТБанк» несет ответственность за подготовку и представление годового отчета в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета, не содержащего существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данного годового отчета и соответствии совершенных ЗАО «МТБанк» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы професс

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

Рэклама без паўз, або Шоу аднаго Булкі

Тэлесеткі

Яе сустракаюць на кожным кроку. Яе люта ненавідзяць. З яе здзекуюцца. У асобных выпадках яе нават забараняюць. І ўсё ж без яе не ўяўляюць прагляду практычна ніводнага фільма або перадачы — асабліва калі перадача ўласна ёй і прысвечана. Пачынаючы з 15 сакавіка, тэлеканал АНТ запускае ў эфір новую штотыднёвую забаўляльную праграму «Рэкламная паўза».

Паводле слоў прадзюсара тэлеканала Ягора Хрусталёва, гледачоў чакае штотыднёвае гумарыстычнае ток-шоу, прысвечанае рэкламе — з дэманстрацыяй забаўных ролікаў з розных краін свету, чытаннем і абмеркаваннем смешных аб'яў, а таксама з адмысловымі заданнямі для гасцей, так ці інакш звязаных з рэкламай — прадзюсараў, рэжысёраў, акцёраў.

— Гэта міжнародны фармат, зроблены ў Вялікабрытаніі. Але мы не цалкам капіравалі яго, дадалі элементаў, якіх не было ў іншых краінах, — расказаў Ягор Хрусталёў. — У нас гэта не проста прагляд смешных ролікаў, а хутчэй ток-шоу. У кожнай праграме ўдзельнічаюць тры госці, якія маюць дачыненне да вонкавай або тэлевізійнай рэкламы. Ім даюцца розныя заданні — адно з іх, напрыклад — прадказаць канцоўку ролика па першых кадрах, альбо з дапамогай гледачоў здагадацца, што менавіта рэкламуецца.

— Ці будзе ў праграме нейкая частка, прысвечаная закліку «Купляйце беларускае»?

— Асобна — не, але над некаторымі не самымі ўдалымі сацыяльнымі ролікамі кшталту «Беражыце ліфт!» аўтарская група паіранізавала, гэта ёсць у сцэнарыі вядучага. Аднак пераважна праграма ўключае замежныя рэкламныя ролікі, зробленыя ў ЗША, Аўстраліі, Сінгапуры, Вялікабрытаніі і г.д. Гэта калі не мастацкія творы, то, ва ўсякім выпадку, вельмі цікавыя, іранічныя і смешныя работы. Увогуле, «Рэкламная паўза» — гэта тыповая праграма выхаднога дня, задача якой не ўздымаць вострыя сацыяльныя пытанні, а прымусіць гледача ўсміхнуцца і разняволіцца.

Але, пабываўшы на здымках першай праграмы, журналісты перахрысцілі праект у «шоу аднаго Булкі». Бо менавіта ён як вядучы шоу бесперапынна каментаваў ролікі, сустракаў і праводзіў гасцей. І паспяваў яшчэ чытаць «кароткі курс гісторыі рэкламы» — гледачам у імправізаванай студыі заставалася толькі апладзіраваць і смяяцца (у спецыяльна адведзеных паўзах). Хоць узровень жартаў вядучага таксама не заўжды быў бясспрэчным, але маєавасць — такая заразлівая штука...

— Здаўна ў рэкламе выкарыстоўваліся жывёлы. Бабры рэкламавалі зубную пасту, трусы — батарэйкі, а Цімаці — моднае адзенне, — абвяшчаў наступны рэкламны блок Яўген Булка, і аўдыторыя, пераважна моладзевая, выбухала рогатам. А на этапе, калі шоўмен «рэкламаваў» уласныя паслугі як вядучага карпаратываў, святаў і вясельляў, здаецца, некаторыя нават наважыліся запісаць кантактны тэлефонны нумар — і вельмі засмуціліся, што ён так і не быў названы.

Адным з першых гасцей «Рэкламнай паўзы» стаў лідар гурта «Лепрыконсы» Ілля Міцько, якому зноў прадказальна дасталася за «рэкламу спявачкі Жанэт і нейкага там мабільнага аператара».

— Перад вамі чалавек, які ў цвярозым розуме і здаровай памяці гаворыць «Чыкі-чыкі-ваў!» — адрэкамендаваў госця вядучы.

— Калі б можна было адкруціць час назад, то я адмовіўся б здымацца ў гэтым ролику, увогуле з'ехаў бы на гэты час з Беларусі, выправіўся ў адпачынак! — раздражнёна прызнаўся артыст.

— Але, калі б ты адмовіўся здымацца, не было б на што паехаць на адпачынак! — парыраваў Яўген Булка.

Наступнай госці — тэлевядучай АНТ Люсі Лушчык — выпала зачытваць уголас забаўныя рэкламныя аб'явы з газет:

— Прадаюцца чарвякі — моцныя, дужыя, натрэніраваныя... Рыба будзе задаволеная, — са здзіўленнем у голасе агучвала тэкст аб'явы Люся. А наступную аб'яву і ўвогуле не здолела прачытаць — не таму, што ў дзяўчыны праблемы са зрокам ці складаннем літар у склады, а таму, што тэкст здоўшага быў набраны незразумелымі іерогліфамі — пэўна, на кітайскай.

Дарэчы, кожнаму з гасцей аўтары падрыхтавалі ў падарунак спецыяльныя постэры — своеасаблівыя сяброўскія шаржы на рэкламу, з якой звязана імя гэтага чалавека. Напрыклад, фота Люсі Лушчык, абранай тварам кандытарскай фабрыкі «Спартак», стала асновай для рэкламы балета «Спартак», кінатэатра «Спартак», аднайменнага футбольнага клуба...

На што беларусы могуць памяняць малую медыцынскую энцыклапедыю і паліраваную кніжную шафу, чаму нельга забывацца павіншаваць сакратарку з яе прафесійным святам, колькі гадоў трэба вучыцца ў некаторых аўташколах — пра ўсё гэта, як і пра і многія іншыя «ляпы», адкрыцці і нечаканасці ў свеце рэкламы, гледачы даведаюцца ўжо 15 сакавіка. Сярод гасцей першых выпускаў «Рэкламнай паўзы» — кліпмейкер Уладзімір Янкоўскі, спявачкі Аня Шаркунова і Алеся, акцёры Сяргей Навіцкі і Анатоль Голуб і іншыя.

Усяго ж, паводле слоў прадзюсара АНТ Ягора Хрусталёва, у эфіры выйдзе не больш за 15 праграм, так што перапынак на смех з рэкламы працягнецца прыкладна да пачатку летніх канікулаў. А ў найбліжэйшы час на АНТ стартуе яшчэ адзін забаўляльны праект — «Ранішняя пошта» з «паштальёнамі» Яўгенам Смарыгіным і Дзмітрыем Танковічам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (11 сакавіка). По гарызанталі: Клямка. Ява. Папірус. Чабан. Карэта. Насос. Лакуна. Кобальт. Прарок. Астра. Табу. Секанс. Навала. Кіраса. Вол. Пат. Балід. Скатка. Цар. Аск. Ікар. Фара. Пара. Філін. Асёл. Мука. Пас. Крапіва. **По вертыкалі:** Укос. Епіскап. Кубак. Адаптар. Лён. Саксафон. Капітэль. Статак. Тата. Лама. Спічак. Ісус. Унт. Канёк. Выраб. Лак. Анапа. Бор. Асіна. Гама. Сват. Рагавіца. Сноб. Лодар. Купал. Разетка.

КЛЁВА!

Фота Іллі ВАКУЛІЧА.

Практыка

ШТО МІЛЕЙ АКУНЮ... І РЫБАЛОВУ?

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 10 лютага.)

ВЯСНА

Рыба становіцца больш актыўнай, але толькі не акунь, — ён звычайна такі ж гультаяваты, як і ў глухазімʼе, яшчэ і ікрой або малокай набіты, таму яму зусім не хочацца перамяшчацца. На блешню амаль не рэагуе, затое на мармышку ловіцца адзін за другім. Магчыма, гэта звязана з тым, што пад вадой адбываюцца значныя змены, прачынаюцца лічынкі, і зараз яны складаюць асноўны корм акуня. Бяспрэчная перавага мармышкі ў такіх умовах відавочная. Але калі падвесці вынік усяго вышэйсказанага, то мармышка ўсё ж мае невялікую перавагу. Нягледзячы на тое, што гэтая снасць з'яўляецца больш далікатнай, з ёй вярнуцца без улову практычна немагчыма. Ну, а калі хочаце лавіць толькі буйную рыбу, то лоўля на блешню — гэта для вас.

ТРОХІ ПРА ШТУЧНЫЯ ПРЫНАДЫ

Яны выкарыстоўваюцца як у лоўлі на мармышку, так і на блешню. Для мармышкі самай распаўсюджанай прынадай з'яўляецца штучны матыль. Гэта палоска гумы даўжынёй 1—2 см чырвонага колеру, яна можа быць прапітаная рознымі пахкімі рэчывамі, якімі, як запэўніваюць вытворцы, рыба спакушаецца лепш нават, чым натуральнымі. Але трэба заўважыць, што акунь на стаячую мармышку са штучнай прынадай брацца не будзе, тут важная гульня прынады. Таксама вельмі нядрэнна працуе падсадка са штучнай дзядоўнікавай молі. Гэта такія шарыкі дыяметрам у 1—2 мм. Яны бываюць розных колераў — ад белага (прыродны колер молі) да чорнага. Самымі ўлоўнымі з'яўляюцца чырвоны, белы і жоўтыя колеры. Дарэчы, яны нядрэнна спалучаюцца на кручку мармышкі, і можна насаджваць на яе ўсе тры адначасова. Для блешні ж дзядоўнік — асноўная падсадка, за кошт маленькага памеру яна не псуе гульню прынады, у адрозненне ад штучнага матыля. Адзінае выключэнне — колер прынады, якую падсаджваюць на блешню, павінен быць аднолькавым.

Коратка

САКАВІК

Лоўля рыбы ў сакавіку — занятак займальны, але небяспечны, бо сакавіцкі лёд, нягледзячы на тое, што ў гэты час ён сухі і мае досыць вялікую таўшчыню, з'яўляецца вельмі крохкім і можа праламацца вельмі нечакана. Менавіта таму выходзіць на сакавіцкую рыбалку рэкамендуецца падстраховаўшыся і, пажадана, не ў адзіночку. Як ва ўсёй прыродзе, так і ў паводзінах рыб назіраецца ажыўленне, яны пакідаюць свае зімовыя хованкі і накіроўваецца ў месцы, дзе лёд ужо адступіў, дзе вада ўзбагацілася кіслародам. У некаторых відаў рыб у гэты час назіраецца пераднераставы перыяд, які суправаджаецца актыўным жорам. Найбольш актыўна рыба бярэцца з-пад лёду якраз у сакавіку на мяжы зімы — вясны. Снасці ў перыяд сакавіцкай лоўлі трэба выбіраць больш трывалыя, бо рыба, набраўшыся моцы пасля зімовага стаяння, праяўляе вялікую актыўнасць і здольная парваць лёску, якая перад тым падыходзіла для зімовай лоўлі.

Акунь, які набраўся моцы, ловіцца ў гэты час лепш за ўсё на мармышку з матылём або дзядоўнікам. Таму, што акунь ходзіць пераважна чарадой, і ўлічваючы тое, што ён бярэцца ў сакавіку досыць актыўна, лавіць яго лепш не па адным. Трэба, каб прынада пастаянна была ў лунцы, інакш касяк можа сысці, а прабіць наступную лунку ў сапраўды патрэбным месцы досыць складана (толькі хіба што выпадкова). Досыць паспяховая ў сакавіку лоўля шчупака, пераважна на жарліцы, а таксама на зімовую блешню. Бярэцца ён аж да поўнага сходу лёду. Лоўля белай рыбы ў сакавіку будзе найбольш плённай, калі ў якасці прынады выкарыстаць матыля, таксама ўдалай можа быць лоўля і на мармышку.

ШЧУПАК І ПЛОТКА

Плотка актывізуецца з пачаткам адлігі. Лічыцца, што як толькі вясной тэмпература пачала падымацца, трэба браць снасці і ісці да найбліжэйшага вадаёма. Часам плотка трапляецца на кручок у студзені і лютым, але толькі ў час моцных маразоў. Нераст у плоткі адбываецца ў канцы красавіка — пачатку мая, тады яна збіраецца ў чараду і трымаецца паблізу ад берагоў. У гэты час плотка вельмі рэдка трапляецца на кручок, хіба што машынальна можа схапіць прынаду.

Шчупак прыходзіць у актыўнасць у пачатку вясны, і яго можна паспяхова лавіць увесь светлавы дзень. Увесну рабіць гэта трэба з асцярогай, выкарыстоўваючы тонкія снасці, паколькі рыба толькі выйшла з зімовай спячкі і яшчэ пакуль крыху марудлівая і палахлівая. У перыяд нераста плоткі з канца красавіка па пачатак мая, шчупак трымаецца побач з чарадой плоткі, разлічваючы на здабычу, і рэдка трапляецца на прынаду.

СТАНЕ БОЛЬШ ПРЫМЕТНЫМ

Калі рыба бярэцца слаба, хістанні кіўка зімовай вудачкі ледзь улоўныя для вока. Яны будуць больш прыметныя, калі ківок забяспечыць здымным прыстасаваннем.

На адным канцы стрыжня з тонкага пругкага дроту (струны) выгінаюць клямар, да другога мацуюць лёгкі шарык з корка, пенапласту, пафарбаваны ў чырвоны колер. Клямарам стрыжань далучаюць да канца кіўка — гумавай трубкі. Цяпер нават самае невялікае зрушэнне канца кіўка ўверх і ўніз, калі рыба будзе ледзь варушыць прынаду, адклікаецца больш шырокім ваганнем шарыка. Яшчэ варыянт. З корка або кавалка электраізаляцыі выразаюць невялікі цыліндрык. У ім папярок, крыху вышэй за восевую адтуліну, робяць маленькі скразны пракол. У гэты пракол трэба працягнуць лёску, абгарнуць яе вакол цыліндрыка, зноў працягнуць у тым жа кірунку ў пракол, кончык абрэзаць і аплавіць. На лёску апранаюць кавалачкі каляровай пластмасавай ізаляцыі ад мантажнага дроту, стваральчы пяцельку кіўка. Даўжыню лёскі выбіраюць па вазе мармышкі. Мацаванне кіўка атрымліваецца цвёрдым, калі цыліндрык надзеты на канец вудачкі. Моц яго можна павялічыць, калі зрабіць двайным.



Лялька нясе дабро

У Мінску ў Доме-музеі І з'езда РСДРП праходзіць выстава славянскіх тэкстыльных абрадавых лялек. Як паведаміла куратар выставы Надзея Кухарэнка, тут можна прасачыць не толькі гісторыю стварэння народных цацак, але і пабываць на майстар-класах па іх вырабе і нават набыць экзэмпляр, які спадабаўся. Кожны экспанат мае сваё значэнне. Паводле слоў Надзеі Кухарэнкі, з узнікненнем ткацтва пачалі вырабляць тэкстыльныя лялькі, часта з паношанага адзення. Лічылася, што менавіта ў такім адзенні захоўвалася энергетыка чалавека, сям'і і цэлага роду, таму лялька з такой тканіны нясе дабро.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

Любую жонку і матулю
Антаніну Сяргееўну ТРУХАН *віншуем*
з 70-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту ў сям'і, бадзёрага настрою.
Муж, дзеці і іх сем'і,
г.п. Старобін.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.27	18.11	11.44
Віцебск —	6.17	18.01	11.44
Магілёў —	6.17	18.02	11.45
Гомель —	6.13	17.59	11.46
Брэст —	6.42	18.27	11.45
Гродна —	6.42	18.28	11.46

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Антаніны, Еўдакіі, Надзеі, Васіля, Пятра.*
К. *Евы, Мацільды, Міхала.*

Фота Мары ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

14 сакавіка

1902 год — нарадзіўся Павел Сцяпанавіч Малчанаў, выдатны беларускі акцёр, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, з 1952 года — у Купалаўскім тэатры. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Стварыў яркія народныя характары, вобразы трагічных і драматычных герояў. Рэжысёр тэатра і кіно, аўтар кнігі ўспамінаў «Тэатр — маё жыццё».

1953 год — Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў выбраны Першым сакратаром ЦК КПСС.

Цытата дня:

«Можна дваццаць гадоў сумнявацца, вагацца перад тым, як зрабіць адказны крок, але нельга адступаць, калі ён ужо зроблены».
Альфрэд дэ Мюсэ (1710-1757), французскі паэт-рамантык.

Гуканне вясны, Аўдакея, Яўдоха, Аўдоння, Аўдоцця — вясноўка

Калі на Еўдакею курыца з-пад страхі напʼецца, так на Благавешчанне (7 красавіка) — вол.

Калі гэты дзень туманны, то будзе ўраджай на стручковыя расліны; калі ж мяцеліца і завіруха, то ў гэтым годзе трэба чакаць вялікага холаду.

Аўдоцця пагодна — усё лета прыгодна.
Еўдакія красна і вясна красна (цёплая).

- У адрозненне ад пераважнай большасці каляндарных святаў, якія маюць дакладную па часе прымеркаванасць, гуканне вясны адзначалася ў розных геаграфічных зонах у розны час. Амплітуда ваганняў была даволі значнай — ад Масленіцы да другога дня Вялікадня. Такі вялікі дыяпазон можна патлумачыць дзвюма прычынамі. Па-першае, геаграфічна-кліматычнымі ўмовамі; па-другое, значным уплывам хрысціянскага календара і ўвядзеннем Вялікага посту. Якраз гэтыя фактары «прымусілі» вяскоўцаў выйсці за межы посту і сумясціць абрад «Гуканне вясны» з Масленіцай або прымеркаваць яго да значных святаў хрысціянскага календара — Саракоў (дакладней, дня ўшанавання Сарака севастыйскіх мучанікаў) — 22 сакавіка (9 сакавіка) і Дабравешчання (Благавешчання, Звеставання) — 7 красавіка (25 сакавіка). У той год, калі Вялікдзень святкавалі даволі рана (сакавік), свята «Гуканне вясны» адзначалі на другі дзень яго святкавання, зноў жа выходзячы за межы посту і саступаючы дарогу найвялікшаму святу Уваскрэшання Хрыстова.
- Усе сельскагаспадарчыя работы ўктывізаваліся пасля Еўдакіі.
- Пасаджанае ў гэты дзень каліва ў гаршчочках, па народных уяўленнях, не пацерпіць ад маразоў.
- На Аўдоцці снег, па старажытным павер'і, набывае асаблівую лекавую моц. Яго збіраюць па пагорках, якія ўжо сагрэтыя сонейкам, і пасля гэтага даюць хворым для пазбаўлення ад розных немачаў.
- Вельмі ўдалым лічылася ў гэты дзень сустрэча з ластаўкай. У такім выпадку неабходна было кінуць ёй услед жменю зямлі і сказаць: «На табе, ластаўка, на гняздо!». Такія дзеянні прынясуць чалавеку дабрабыт і здароўе.
- А яшчэ ў гэты дзень з лесу неслі галінкі дрэў і падпальвалі імі ў печы — «каб вясна была цёплай».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Пілавінне для... масажу

Нашы продкі, незнаёмыя з хімічнымі лекамі, многія стагоддзі ўмелі знаходзіць спосабы лячэння самых розных хваробаў у прыродзе. Крыніцай здароўя для іх заўсёды быў лес. Аднак не толькі знаходжанне сярод дрэў лечыць цела і душу. Нават простае драўнянае пілавінне можа спатрэбіцца чалавеку для правядзення лекавага масажу пры розных захворваннях.

СОЛАДКА СПАЦЬ, ЛЁГКА ЎСТАВАЦЬ

Лічыцца, што ўсе дрэвы дзейнічаюць на чалавека па-рознаму. Напрыклад, бяроза ці дуб зараджаюць нас энергіяй, а вось асіна, наадварот, адбірае яе, вызваляе ад цяжару, які назапасіўся за ўвесь дзень. Усё гэта лёгка праверыць пры дапамозе масажу ступняў. Пілавінне для такога масажу павінна быць абавязкова сухім. Запоўніце ім скрынку ці кардонку такога памеру, каб ступні свабодна ўваходзілі і выходзілі. Насыпце пілавіння столькі, каб яно толькі пакрывала ступні, і не больш.

Скрыня, напоўненая **асінавым** пілавіннем, прызначана для таго, каб зняць нераўзбуджэнне, заспакоіць пасля працоўнага дня і наладзіць арганізм на сон. Гэта куды лепш, чым глытаць снатворныя таблеткі. Ногі ў такой скрыні трэба трымаць на працягу 15—20 хвілін. Спачатку патапчыцеся ў ёй стоячы, а затым прысядзьце і паварушыце пілавінне нагамі.

Зранку для масажу рэкамендуецца выкарыстоўваць **бярозавае ці дубовае** пілавінне. Яно дасць зарад бадзёрасці і энергіі на ўвесь дзень.

ДРАЎНІННАЯ АПТЭКА

Спосабаў масажу пры дапамозе пілавіння многа, аднак часцей выкарыстоўваюцца прыкладанне сшытых мяшочкаў, напоўненых пілавіннем, і абкручванне ў гарачае пілавінне з каштоўных парод дрэў. Іншы раз у яго дадаюць і лекавыя зёлкі.

- Добры эфект пры запаленнях, расстройствах кішэчніка дае мяшочак з пілавіннем **таполі**. Яго рэкамендуецца прыкладваць на 1—2 хвіліны да месца запалення, а пасля яшчэ на 2—3 хвіліны — мяшочак з дубовым пілавіннем.
- Пры міязіце (запаленні мышцаў) прымяняецца мяшочак з **ліпавым** пілавіннем. Трымаць яго трэба 5 хвілін. Такі масажны мяшочак расслабляе мышцы, заспакойвае боль.
- А вось **сасновым** пілавіннем здаўна лечаць радыкуліт. Для гэтага пілавіннe неабходна насыпаць у вялікую эмаліраваную каструлю, наліць вады, шчыльна закрыць накрыўкай і паставіць на самы слабы агонь у духоўку. Калі вада выпарыцца, а пілавінне распарыцца, яго трэба рассыпаць роўным слоем на цырату, а зверху пакласці прасціну. Хворы кладзецца на лекавую падсцілку, зверху накрываецца коўдрай. Працэдура працягваецца да таго часу, пакуль пілавінне не астыне. Пасля такога масажу неабходна цёпла апрануцца.

ПАДКАЗКІ АЎТААМАТАРАМ

Кампактная прылада

Калі пусты флакончык з-пад лаку для пазногцяў запоўніць фарбай, прызначанай для падфарбоўкі аўтамабіля, атрымаецца зручнае прыстасаванне для выканання гэтай работы — тонкім пэндзлікам, замацаваным у корку, можна акуратна пакрыць дробныя сколы фарбы і драпіны на кузаве.

Чым лепш фарбаваць дыскі колаў?

З усіх варыянтаў афарбоўкі колавых дыскаў, бадай, самыя лепшыя вынікі дае пакрыццё іх паркетным лакам у 2—3 слаі, змешаным з алюмініевай пудрай.

-2559-

ДА ВАШАГА СТАЛА

Гатуем без мяса

Пасціць не так ужо і складана, як здаецца. Вунь колькі смачных і карысных страў можна прыгатаваць у гэтыя дні.

Салата вітамінная

1/4 невялікага качана капусты (можна напалову з чырвонакачанай), 2 апельсіны, чорны молаты перац, соль.

Нашаткуйце капусту і злёгку разамніце, каб стала мяккай. Выцісніце сок з аднаго апельсіна. Другі раздзяліце на частачкі, зніміце плёнкі. Змяшайце капусту з апельсінам, паперчыце, пасаліце, паліце апельсінавым сокам.

Суп па-вясноваму

0,5 шк. рысу, 2 морквіны, 4 бульбіны, 1 сцябліна сельдэрэю (можна сушанага), 1 цыбуліна, соль, перац, зяленіва.

У ваду, якая кіпіць, пакладзіце цыбуліну. Пагатуйце 20 хвілін, затым дастаньце. Парэжце моркву кружочкамі, апусціце ў булён. Пасаліце, паперчыце. Праз 20 хвілін дадайце парэзаную бульбу, затым прамыты рыс і сельдэрэй. Праз хвілін 5—7 пакаштуйце суп на соль: рыс моцна ўсмоктвае яе ў сябе. Калі рыс і морква будуць гатовыя, выключыце агонь. Пасыпце страву зяленівам.

Рыбныя палачкі з пюрэ

400 г любога рыбнага філе, 1 кг бульбы, 100 г кансерваванай кукурузы, 1/2 шк. чырвонай фасолі, алей, паніровачныя сухары, чорны молаты перац, соль.

Замачыце фасолю ў халоднай вадзе на 2 гадзіны. Адварыце яе ў падсоленай вадзе, асобна зварыце бульбу. Прыгатуйце бульбянае пюрэ на вадзе. Зліце з кукурузы сок, змяшайце яе з пюрэ і фасоляй. Рыбнае філе парэжце на прамавугольнікі, абкачайце ў паніровачных сухарах, падсмажце на алеі, пасаліце, паперчыце.

НА ЎСЕ ВЫПАДКІ ЖЫЦЦЯ

Карысныя дробязі

Наша жыццё ў многім складаецца з дробязяў, у тым ліку і бытавых. Менавіта яны здольныя значна палегчыць будзённае жыццё або, наадварот, ператварыць яго ў кашмар. Прапануем некалькі карысных парад і арыгінальных «бытавых» знаходак.

Як асвяжыць красоўкі?

Той, хто носіць спартыўны абутак, рана ці позна сутыкаецца з праблемай дрэннага паху. Каб пазбавіцца ад гэтай напасці, насыпце ў старыя шкарпэткі напаўняльнік для кацінага туалета, пакладзіце іх у красоўкі і пакіньце на ноч.

Доўгае жыццё клею

Суперклей, як новы, так і пачаты, праслужыць значна даўжэй, калі захоўваць яго ў халадзільніку.

Жаўток ад бялку

Раздзяліць яйка на жаўток і бялок вельмі проста пры дапамозе лейкі. Жаўток застране ў гарлавіне, а бялок бесперашкодна сцячэ ўніз.

Захоўванне тэрмаса

Тэрмас звычайна выкарыстоўваецца рэдка і калі захоўваць яго зачыненым, унутры ўтвараецца затхлы пах. Таму проста пакладзіце накрыўку зверху і не закручвайце яе шчыльна. Калі праблема з пахам усё ж узнікла, наліце ў тэрмас кіпень і дадайце соду, пакіньце на ноч, зранку добра апаласніце — непрыемны пах знікне.

Выручыць фольга

- Каб пачысціць сталовыя прыборы з серабра, пакладзіце на дно міскі фольгу, на яе — прыборы, заліце ўсё гарачай вадой на гадзіны дзве.
- Маленькія кавалачкі фольгі, скручаныя ў шарыкі, можна скарыстаць для адмывання вогнетрывалага посуду.

-2560-

Усміхнёмся!

Кнігі Дар'і Данцовай рэкамендаваныя Міністэрствам адукацыі для ацяплення сельскіх школ.

☺

Бацька і сын — паморы, прыбылі з рыбай у англійскі порт. Бацька дамаўляецца з англійскім купцом. Паказвае на скрыню з рыбай — 1 палец, потым паказвае на купца — 2 пальцы:

— Му-у!

Потым паказвае 3 пальцы:

— Бэ-е!

Купец забірае рыбу і дае 2 каровы і 3 бараны. Сын (сам сабе):

— Вось вырасту, таксама вывучу англійскую...

☺

Апошні абзац у рэцэпце з кулінарнай кнігі:

...Перад тым, як выліць гатовую страву з каструлі, пераканайцеся, што пад вокнамі нікога няма.

☺

— З якога гэта часу вы працуеце на нашым прадпрыемстве?

— З таго часу, як прыстрашылі, што звольняць.

☺

Сіноптыкі адкарэктавалі прагноз на сакавік. У фразе «Вясна будзе ранняй і незвычайна цёплай» Гідраметэацэнтр пацвердзіў пэўнасць толькі першых двух слоў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкоm, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1394. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12